№ 37 (539) 11 кастрычніка 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## «Эўрапейскі марш» дазволены

Але па Сурганава. Заяўнікі маюць намер правесьці маніфэстантаў ад Кастрычніцкай да Акадэміі навук. Мілінкевіч: «Іду на Бангалор, хоць гэта цяжкое маральнае пытаньне і ісьці туды ня хочацца». Старонка 5.

### У НУМАРЫ

**Нацыянальная ганьба**

Хто чыніць акты вандалізму ў Курапатах? **Старонка 3.**

**ЬЬЬ**

У працяг правапіснай дыскусіі піша Даніла Жукоўскі. **Старонка 22.**

**Абухоўскі, Будзінас**

Гэты сьвет пакінулі археоляг і пісьменьнік. **Старонка 18.**

**Гукі Хатыні**

Складанка-прысьвячэньне Хатыні з удзелам сусьветных зорак. **Старонка 20.**

## «Белсат» здымае «Тутэйшых»



Рэжысэр: у «Тутэйшых» будзе ўсё, што трэба галівудзкаму шэдэўру. **Старонка 4.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Нацыя хоча адчуць сябе камандай

Посьпех беларускіх баскетбалістак параўноўваюць з хакейнай удачай на Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці. Краіна прагне камандных перамог. Піша Зьміцер Панкавец. **Старонка 15.**

**Баскетбалістак у аэрапорце чакала сотня фанаў. На фота: Натальля Марчанка, якая ўвайшла ў сымбалічную зборную Эўропы.**

## Сустрэча з рэдактарамі «ARCHE» і «НН»

**12 кастрычніка** сустракайце рэдактара часопіса «ARCHE» Валера Булгакава і рэдактара газэты «Наша Ніва» Андрэя Скурка **ў 15.30 у Бялынічах і ў 18.30 у Магілёве.** Дзе пройдуць сустрэчы, можна дазнацца праз т.: (029) 620-32-10 (Алег, Бялынічы) і 388-35-61 (Алег, Магілёў).

**25 кастрычніка** Булгакаў і Скурко прыедуць **у Горадню.** Сустрэча пройдзе **а 18.30 у памяшканьні Таварыства беларускай школы (вул.-Будзённага, 48а).** Чакаецца ўдзел гарадзенскіх гісторыкаў і літаратараў.

# Азаранка сэнсацыйна перамагла Шарапаву

ў матчы за выхад у 1/4 фіналу «Кубку Крамля».



Вікторыя Азаранка займае ў сусьветным рэйтынгу 32-і радок. Марыя Шарапава, якую яна апярэдзіла ва ўсіх паказьніках — 4-ы. Суперніцай 18-гадовай беларускі ў 1/4 фіналу будзе расіянка Алена Дзяменцьева.

**ЗП**



# Матафонаў запрашае ў «Лябірынты»

14 кастрычніка на тэлеканале «Лад» пачынаецца цыкль аўтарскіх перадачаў Аляксандра Матафонава «Лябірынты». «Гэта будуць праграмы пра духоўны сьвет беларусаў. Аб таямніцах і культурных каштоўнасьцях краіны. Пра сьветаўспрыманьне, лад і мудрасьць беларусаў», — кажа аўтар.

Цыкль выходзіць у нядзелі ў 13:05.

**Ул.інф.**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84

# СНДЭўразЭСАЭПГУАМ...

Колькасьць створаных пры Садружнасьці арганізацый проста вырубае: ЭўразЭС, АДКБ, ГУАМ, Мытны саюз Казахстану, Расеі і Беларусі, Саюз Расеі і РБ... Баюся, позна ці рана прэзыдэнты пачнуць блытацца. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Бішкек.Саміт садружнасьці. 2024 г.

**Кіргізія:** На правах гаспадара, дазвольце абвесьціць наш саміт адчыненым. Пачнём перамовы з пункту «Інтэнсіфікацыя працэсаў інтэграцыі ў рамках ЭўразЭСу пасьля выхаду зь яго Малдовы і прыяднаньня Азэрбайджану». Прэзыдэнты краінаў, якія не ўваходзяць у структуру могуць паехаць на экскурсію на возера Ісык-Куль. Вам чаго, грузіны?

**Грузія:** Мы пакідаем саміт, паколькі лічым структуру СНД палітычным трупам.

**Расея:** Дык вы ж ужо выйшлі на мінулым саміце.

**Грузія:** Што, сапраўды? Зараз праверым.

**Таджыкістан:** Прабачце, а мы ўваходзім у гэты самы ЭўразЭС?

**Беларусь:** Таджыкі дакладна не ўваходзяць. Я памятаю, на мінулым саміце ў Піцеры ў ЭўразЭС былі мы, казахі і, здаецца, Азэрбайджан.

**Украіна:** Вы пералічылі краіны, якія фармуюць «Мытны пладова-ягадны прастор», а ЭўразЭС — гэта кшталту арганізацыі па каардынацыі барацьбы з наркотыкамі. Аднак толькі з аўганскімі апіятамі. З амфэтамінамі ў нас змагаецца асобная структура — Аб’яднанае Вайсковае Камандаваньне ГУАМУ плюс Туркмэністан.

**Туркменістан:** Мы?

**Расея:** Перастаньце дурыць, з аўганскай шмальлю ў нас змагаецца Саюз Расеі і Беларусі. Можаце мне паверыць як кіраўніку краіны, якая выконвае абавязкі старшыні Саюзу?

**Азэрбайджан:** Самазванцы! Гэта я старшыня Саюзу РФ і РБ.

**Беларусь:** Алё, папрашу даць даведачку. Зь якога гэта часу мы сталі сябрамі Саюзу Расеі і Беларусі?

**Расея:** Прачніцеся! Пасьля вайсковых вучэньняў у рамках Ганконскай групы на Мангышлаку.

**Беларусь:** Нешта ў памяці прасьвятляецца. А хто, нагадайце, быў нашым умоўным праціўнікам? Газпром?

**Грузія:** Хвілiначку! Мы праверылі файлы. На мінулым саміце Грузія не выходзіла, а ўступіла ў СНД пасьля таго, як год байкатавала яе дзейнасьць з-за правакацый Расеі ў Абхазіі. Такім чынам, цяпер мы маем права дэманстратыўна пакінуць саміт. Прашу задаволіць наша патрабаваньне і вынесьці адпаведную рэзалюцыю на галасаваньне.

**Кіргізія:** Добра, галасуем. Хто за тое, каб выключыць Грузію са складу СНД? Хто супраць? Хто ўстрымаўся. Так: усе за. Супраць Малдова і Самалі. Стоп. Прычым тут Самалі?

**Самалі:** А хіба мы не сябры Садружнасьці?

**Беларусь:** Самалійцы дакладна сябры. Я памятаю, на мінулым саміце ў Піцеры ў ЭўразЭСе былі мы, самалійцы і, здаецца, Азэрбайджан...

**Сур’ёзна на тэму СНД — старонка 6.**

# Нацыянальная ганьба



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У панядзелак раніцай наведнікі Курапатаў убачылі, што ля ўваходу ва ўрочышча пабураны крыж «Пакутнікам Беларусі». Праўдападобна, вандалы пабывалі ва ўрочышчы ў нядзелю.

Ігар Вашкевіч, які жыве побач з Курапатамі, кажа, што яшчэ ўчора бачыў недалёка ад гэтага трох маладзёнаў, з пляшкамі піва ў руках, якія несьлі з сабой калючы дрот. «Тады мне і падумалася, што такі дрот я бачыў на крыжы ва ўрочышчы, таму сёньня з раніцы і прыехаў сюды», — кажа Вашкевіч.

Апроч Ігара ля паваленага крыжа таксама стаіць актывіст КХП-БНФ Валер Буйвал, ён гаворыць, што яшчэ ўчора вечарам крыж стаяў на месцы. Ігар Вашкевіч паказвае, што зламаць крыж можна было толькі вельмі вялікай сілай, бо трэба было разагнуць жалезныя замацаваньні, але ў некага моцы хапіла.

Заўважаем, што чарговы раз паваленая ў Курапатах і «лава Клінтана», але Валер Буйвал кажа, што яе ўжо досыць даўно ня могуць добра замацаваць, таму і такія здарэньні адбываюцца пэрыядычна.

Штогод на Дзяды сябры КХП-БНФ ладзяць жалобнае шэсьце ў Курапаты. Да сёлетняй акцыі чальцы партыі плянуюць зноў аднавіць крыж.

**Зьміцер Панкавец**

### На курапацкім камяні выбілі надпіс «Ахвярам сталінізму»

Сябры грамадзкага камітэту дзеля ўшанаваньня памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій перарабілі закладны курапацкі камень у памятны знак.

У 1989 г. на камяні была ўсталяваная шыльда з надпісам, што ў адпаведнасьці з пастановай Савету міністраў тутбудзе ўзьведзены помнік ахвярам рэпрэсій.

Шыльду ў 2005 г. скралі. Сябры грамадзкага камітэту сёлета аднавілі шыльду і ў мінулыя выходныя ўсталявалі яе на камені. А на іншым ягоным баку выбілі словы «Ахвярам сталінізму».

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Хто, па-Вашаму, чыніць акты вандалізму ў Курапатах?

| | |
|---|---|
| расейскія шавіністы | 38 (23.6%) |
| п'яныя хуліганы | 34 (21.1%) |
| агенты адной з спэцслужбаў | 51 (31.7%) |
| правакатары | 22 (13.7%) |
| нэасталіністы | 16 (9.9%) |

Усяго прагаласавала: 161

### Севярынец, Міхалевіч і Кузьняцоў ладзяць 3 лістапада антыкамуністычны форум

Антыкамуністычны форум у процівагу камуністычнаму маюць намер правесьці 3 лістапада ў Менску лідэры правага крыла апазыцыі. Форум «У будучыню — без камунізму» сустаршыня аргкамітэту партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Павал Севярынец, намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч і вядомы гісторык Ігар Кузьняцоў вырашылі правесьці ў адказ на ініцыятыву Кампартыі Беларусі і Кампартыі Расеі аб правядзеньні ў Менску 3 — 5 лістапада міжнароднай сустрэчы камуністычных і працоўных партый.

**ЗП**

# «Белсат» здымае «Тутэйшых»



UFF-BY.ORG

Аленку сыграла чароўная Жэня Жуковіч.

«Цішыня на пляне!.. Камэра!.. Гук!... Паехалі!» — крыкам Дарыюша Шады пачынаюцца здымкі кожнай сцэны.

«Белсат» супольна з кінастудыяй «Valred» здымаюць мастацкі фільм паводле п'есы Янкі Купалы «Тутэйшыя».

Ад мінулай пятніцы мястэчка Тыкоцін жыве неспакойна. Вакол мясцовага Дому культуры расстаўленыя пражэктары, сафіты, мітусяцца людзі. Раз-пораз на ганку зьяўляюцца постаці ў гістарычным убраньні. Паляць, размаўляюць, гучна сьмяюцца. Праходзяць мясцовыя, зазіраюць у вокны, зьдзіўлена разглядаюць прыежджых. Чуючы беларускую мову, некаторыя пасьпешліва зьбягаюць.

У Тыкоціне аддаўна жылі беларусы. Першыя ўзгадкі пра мястэчка адносяцца да XIII стагодзьдзя. Тут захаваліся старажытныя царква й касьцёл. Усе вуліцы пракладзеныя брукам. Час ад часу праяжджаюць конныя брычкі. На Цэнтральным Доме культуры, дзе здымаецца фільм — колішнім маёнтку, — вялікая пакінутая бусьлянка. Навакол гучыць беларуская, расейская, польская мова. Ну чым ня Менск пачатку стагодзьдзя?

Рыхтуюцца сцэны ў салёне. Ля дзьвярэй паўтарае тэкст Мікіта Зносак — ужо напудраны й як сьлед апрануты Павал Харланчук. Ягоны вобраз вельмі складаны. Узгадайма Купалу, Зносак убірае ў сябе найпаскуднейшыя рысы беларуса: прыстасавальніцтва й угодніцтва ўладзе. Ягоны антыпод — Янка Здольнік, альбо «дзядзька беларус». За кулісамі і ў жыцьці — кінаактор Анатоль Кот. Згублены ў ліхалецьці інтэлігент, не знаходзіць сабе месца між людзкога двудушнітва й зайздрасьці. Анатоль ужо вывучыў свае словы, таму ходзіць і заляцаецца да мясцовых паненак.

У грымёрцы й касьцюмэрнай рэжысэр Валер Мазынскі дае апошнія ўказаньні перад выхадам на плян. Зараз да Нікіція Зносілова завітваюць госьці — надта высокія й шанаваныя ўладаю людзі, як часта б яна не мянялася. Дама (Тацяна Папова), спраўнік (Мікола Рабычын), поп (Уладзімер Кішкурна), паніч (Франак Вячорка) сьмела ўваходзяць у дом у прадчуваньні вялікага п'янага баляваньня. П'юць самагон, жаруць каўбасу. За цара, за немцаў. Гэтыя людзі страцілі адчуваньне рэчаіснасьці, жывуць ад балю да балю, ад выпіць да закусіць.

Усё здымаецца натураю, таму калі на стале зьядаецца каўбаса, селядзец ці выпіваецца вада, адказны ў здымачнай групе неадкладна ўзнаўляе першапачатковы выгляд стала перад здымкамі новага дублю. У кіно такая дробязь прадугледжваюцца, каб не атрымалася, што ў адным кадры будзе каўбаса, а ў іншым на тым жа месцы — памідоры.

Апэратары на кожнага героя настройваюць камэры, сьвятло, колер, вызначаюць ракурсы здымак. Адна сцэна здымаецца ад двух да чатырох гадзінаў. У перапынках акторы абмяркоўваюць посьпехі за капучынай ці гарбатай. Грымёры падпудрываюць запацелыя твары й падцеклую касмэтыку.

Здымкі пачынаюцца а 8-ай раніцы, заканчваюцца пасьля поўначы. Сцэна на кухні здымалася за 5 кілямэтраў ад Тыкоціна ў архаічнай вёсцы. Праца зацягнулася да пятай раніцы. Здымачная група фільмуе дзьве камэры. Як правіла, у дыялёгу здымаюцца абодва пэрсанажы, пры мантажы выбіраюцца найлепшыя адбіткі. Па пакоі расстаўленыя чатыры мікрафоны: два скіраваныя на актораў, два — панарамныя. Гук запісваецца сынхронна выяве.

Над аздабленьнем салёну працавала група мастакоў. У памяшканьні, дзе вяліся здымкі, пераклеілі шпалеры, перафарбавалі дзьверы, усё як сьлед прыбралі да выгляду пачатку XX стагодзьдзя. Крэслы, тумбы, люстра, люстэрка, грамафон, канапы, карціны — антыкварнае. Строі — арыгінальныя.

Аўтары абяцаюць, у «Тутэйшых» будзе ўсё, што патрэбна любому галівудзкаму шэдэўру: гарачае каханьне паміж Здольнікам і Аленкай (Жэня Жуковіч), глыбокі псыхалягізм у размовах Зносака са Здольнікам і баявік па прыходзе чырвонаармейцаў. Акторы прызналіся, што фінал плянуецца драматычны і крывавы. Усіх расстраляюць.

Стужка «Тутэйшыя» робіцца для каналу «Белсат». Спадарожнікавы канал для Беларусі стартуе 10 сьнежня і плянуе працягваць вытворчасьць мастацкіх кінастужак. Драматург Аляксей Дудараў ужо выказаў згоду на пастаноўку адной са сваіх п'есаў. Для маладых драматургаў і сцэнарыстаў аб'яўлены конкурс на найлепшую ідэю для фільму. Найлепшыя задумы будуць зрэалізаваныя, а пераможца атрымае буйную грашовую ўзнагароду.



UFF-BY.ORG

«Янка Здольнік» адпачывае паміж сцэнамі.

**Франак Вячорка, Uff-by.org**

# «Эўрапейскі марш» дазволены

Але пройдзе да Бангалору.

Заяўнікі абяцаюць прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу, каб забраць адтуль усіх людзей, якія першапачаткова прыйдуць туды. Мілінкевіч кажа: «Я пайду на Бангалор, хоць гэта цяжкое маральнае пытаньне і ісьці туды ня хочацца».

Рашэньне прынятае — «Эўрапейскі марш» пройдзе па тым самым маршруце, які прапанавалі заяўнікам менскія чыноўнікі. Яшчэ ў аўторак вечарам усім заяўнікам прыйшлі лісты зь Менгарвыканкаму за подпісам намесьніка старшыні М.Ціцянкова. У адказе гаворыцца, што акцыя 14 кастрычніка дазваляецца па наступным маршруце: Акадэмія навук — вуліца Сурганава — плошча Бангалор. Збор ля Акадэміі а 14:00, заканчэньне акцыі а 19:00. Гэтаму адказу папярэднічалі двухсэнсоўныя перамовы, якія з боку ўладаў вялі галоўны ідэоляг сталічнай адміністрацыі, намесьнік пракурора і заступнік начальніка міліцыі.

У сераду з раніцы заяўнікі «Эўрамаршу» правялі паседжаньне, дзе абмяркоўвалі прапановы Менгарвыканкаму. Урэшце было вырашана згадзіцца з прапанаваным маршрутам. Разам з тым, заяўнікі абяцаюць прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу, каб забраць адтуль усіх людзей, які першапачаткова туды прыйдуць.

«Эўрапейскі марш» дазволілі — гэта пазытыўная навіна, непрыемна толькі, што



PHOTO.BYMEDIA.NET

наша просьба не была задаволеная і нам далі ня той маршрут. Мы ўвесь час гаварылі пра мірны характар і неканфліктнасьць гэтай акцыі, таму і вырашылі пагадзіцца пайсьці на Бангалор. Яшчэ гэта робіцца з той прычыны, што на марш зьбіраецца прыехаць шмат афіцыйных прадстаўнікоў Эўрасаюзу. Мы хочам, каб яны выступілі на акцыі абсалютна легальна і законна», — адзначыў старшыня аргкамітэту Віктар Івашкевіч.

Лідэр АГП Анатоль Лябедзька сказаў, што хоць акцыя ўжо і дазволеная, але на мясцовым узроўні ўлады працягваюць палітыку «запалохваньня, рэпрэсій і правакацый». Ён нагадаў пра затрыманьні, якія гэтымі днямі адбываюцца ў Горадні, Гомелі і іншых гарадах.

«Мы ня мусім заплюшчваць на гэта вочы», — сказаў А.Лябедзька.

Лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка ў сваім кароткім выступе засяродзіўся на пытаньні міжнароднай падтрымкі «Эўрапейскага маршу». Ён адзначыў, што пакуль рана гаварыць пра тое, хто менавіта з эўрапейскіх палітыкаў прыедзе 14-га ў Менск, бо пытаньне выдачы візаў для некаторых вырашаецца толькі цяпер. Вячорка таксама паведаміў, што днямі ён вярнуўся зь Бярозаўскага і Дарагічынскага раёнаў.

«Людзей найбольш хвалюе візавае пытаньне. Сёньня ўжо можна казаць зь вялікай доляй упэўненасьці, што з наступнага году шэнгенскія візы для беларусаў будуць каштаваць амаль у два разы даражэй, чым для ўкраінцаў і расейцаў, і гэтае пытаньне трэба вырашаць», — лічыць В.Вячорка.

Лідэр руху «За свабоду» Аляксандар Мілінкевіч сказаў наступнае:

«У добрых адносінах з Эўропай сёньня зацікаўленыя ўсе, у тым ліку і ўлады. Адзінае патрабаваньне да апошніх — паводзьце сябе прыстойна. Але гэтага няма і блізка. Перакананы, што «Эўрапейскі марш» прадэманструе, што Беларусь існуе і хоча жыць паводле эўрапейскіх нормаў».

Яшчэ вясной Аляксандар Мілінкевіч заяўляў, што больш ня пойдзе на Бангалор. Вось што ён сказаў на гэты конт:

«Для мяне гэта цяжкое маральнае пытаньне. Так, ісьці на Бангалор ня хочацца, але мне ня хочацца таксама выглядаць капрызьлівай паненкай ці тым, хто ня хоча адзінства, таму я пайду на Бангалор», — гаворыць А.Мілінкевіч.

Тым часам улады прадэманстравалі сваё стаўленьне да Маршу дзеяньнямі: у краіне затрымана каля 15 чалавек, якія раздавалі ўлёткі і газэты пра Марш (інфармацыю пра затрыманых вы можаце знайсьці на старонцы **Хроніка апазыцыі**).

Зянон Пазьняк, з свайго боку, заклікаў ігнараваць Марш. Ён лічыць яго бессэнсоўным ці нават шкодным мерапрыемствам. Лідэр Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ выступае супраць эўраінтэграцыі і крытыкуе лідэраў Аб’яднаных дэмакратычных сілаў за, як ён мяркуе, празьмерна цесныя сувязі з Эўропай.

У той жа час шэраг дзеячаў культуры, сярод якіх сьпевакі Кася Камоцкая і Лявон Вольскі, мастак Алесь Пушкін падтрымалі Марш. Сайт Аляксандра Казуліна таксама далучыўся да кампаніі ў падтрымку маніфэстацыі. Усяго ў Інтэрнэце каля 50 сайтаў зьмясьцілі рэклямны плякат Маршу.

Чакаецца, што на Эўрапейскім маршы выступяць прадстаўнікі некалькіх краінаў ЭС. Тое, што ў Беларусі людзі арганізоўваюць маніфэстацыю ў імя эўрапейскіх каштоўнасьцяў, заўважылі і ў Брусэлі. Хаўер Саляна і Бэніта Фэрэра-Вальднэр, кіраўнікі замежнай палітыкі ЭС, выступілі з заявамі вітаньня беларусаў і асудзілі затрыманьні асобаў, што пашыраюць інфармацыю пра Марш.

Пры канцы прэс-канфэрэнцыі Віктар Івашкевіч паведаміў, што сёньня ж возьме брашурку «Што ЭС можа даць Беларусі?», а таксама рашэньне Менгарвыканкаму і зь імі пойдзе ва ўнівэрсытэцкія і завадзкія прахадныя, каб агітаваць людзей прыйсьці на «Эўрапейскі марш».

«Спадзяюся, за інфармаваньне людзей пра рашэньне гарадзкіх чыноўнікаў мяне ніхто не затрымае», — жартуе В.Івашкевіч.

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Як Вы думаеце, колькі людзей зьбярэ «Эўрапейскі марш»?**

| | |
|---|---|
| больш за 30 тысяч | 55 (12.8%) |
| больш за 10 тысяч | 83 (19.3%) |
| больш за 5 тысяч | 85 (19.8%) |
| менш за 5 тысяч | 125 (29.1%) |
| народ не зьбярэцца зусім | 46 (10.7%) |
| няважна колькі, абы я прыйшоў | 35 (8.2%) |

Усяго прагаласавала 429

# Лукашэнка не сустрэўся з Пуціным

У Душанбэ скончыўся саміт Садружнасьці незалежных дзяржаваў. Анансаваная сустрэча прэзыдэнтаў Беларусі і Расеі не адбылася.

«Асобных сустрэчаў Уладзімера Пуціна з прэзыдэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і грузінскім лідэрам Міхаілам Саакашвілі не было», — паведамляе агенцтва РІА «Новости».

Сустрэча Лукашэнкі з Пуціным перад самітам анансавалася прэсслужбай кіраўніка Расеі.

У той жа час Пуцін сустрэўся зь міністрам замежных справаў Украіны Арсенем Яцанюком.

Кіраўнік прэс-службы А. Лукашэнкі Павал Лёгкі паведаміў, што ў Душанбэ А. Лукашэнка двухбаковых перамоваў і не плянаваў.

На саміце СНД у Санкт-Пецярбургу А.Лукашэнка выступіў супраць прызначэньня былога старшыні Цэнтравыбаркаму Расеі Вешнякова на пасаду выканаўчага сакратара СНД. Цяпер ён пагадзіўся з прапановай расейскага боку прызначыць на гэтую пасаду былога дырэктара Службы замежнай выведкі Расеі Сяргея Лебедзева.

**МБ**



### Беларусь зможа купляць расейскую зброю па ўнутрырасейскіх коштах

На тое ж могуць разьлічваць іншыя краіны АДКБ. Аб гэтым Расея абвесьціла ў Душанбэ. Гэтак яна хоча прывязаць да сябе ў вайсковай сфэры краіны былога СССР.

## Для чаго Раман Абрамовіч прылятаў у Менск?

Таемны бліц-візыт Рамана Абрамовіча ў Менск спарадзіў хвалю чутак.

Толькі праз тыдзень стала вядома, што расейскі мільярдэр прылятаў у Менск і можна толькі здагадвацца пра мэты ягонай сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам, паведамляе Расейская служба радыёстанцыі «Бі-Бі-Сі».

Абрамовіч прыляцеў у Менск 25 верасьня зь Лёндану на ўласным «Боінгу» і прабыў у беларускай сталіцы 3 гадзіны 37 хвілінаў.

Усьлед за «Боінгам» у старым менскім аэрапорце, які знаходзіцца практычна ў цэнтры гораду, прызямліўся самалёт з дэлегацыяй расейскіх бізнэсоўцаў на чале з прэзыдэнтам «Слаўнафты» Юр’ем Суханавым.

Генэральны дырэктар прадстаўніцтва «Слаўнафты» ў Менску Сяргей Шаўчэнка ў чацьвер, 4 кастрычніка, вымушана паведаміў «Комсомольской правде в Беларуси», што Раман Абрамовіч абмяркоўваў з Лукашэнкам пэрспэктывы інвэстыцыйнай дзейнасьці.

Беларускія дзяржаўныя СМІ не паведамілі ні слова пра сустрэчу Лукашэнкі зь мільярдэрам.

«Закрытасьць камэрцыйных пагадненьняў, якія зьдзяйсьняе беларускае кіраўніцтва, сама за сябе гаворыць: тут ня ўсё чыста, тут, відаць, ёсьць нейкія шэрыя схемы, якія ўлады спрабуюць схаваць ад грамадзкага кантролю, — адзначае палітоляг Валеры Карбалевіч. — Але беларускія прадпрыемствы належаць усяму народу, а не кіраўніцтву!»

Беларуская дзяржава ўжо рассталася з кантрольным пакетам акцыяў у МЦС (гандлёвая марка Velkom) — найбуйнейшым у краіне апэратарам сотавай сувязі. Невядома за колькі.

У канцы жніўня без абяцанага публічнага тэндэрнага гандлю ўласьнікам кампаніі стаў кіпрскі «SB Telekom Ltd», які належыць сырыйцу.

Менскі мотавелазавод напрыканцы лета перайшоў у рукі аўстрыйцаў расейскага паходжаньня — фірма ATEC Holding GmbH набыла 93 % акцыяў — афіцыйна за сьмехатворную суму 7,2 млн даляраў.

Аналітыкі мяркуюць, што аб’ектам цікавасьці Абрамовіча маглі быць беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы.

**МБ; charter97.org**

## СЬЦІСЛА

### Перамовы аб пастаўках газу ў Беларусь

Міністар энэргетыкі Аляксандар Азярэц і гендырэктар ААТ «Белтрансгаз» Уладзімер Маёраў 11 кастрычніка вялі ў Маскве перамовы з кіраўніцтвам «Газпрому» аб пастаўках газу ў Беларусь у 2008 г. Чакаецца, што маратон перамоваў аб цане зацягнецца да Новага году.

### «Маладому фронту» зноў адмовілі ў рэгістрацыі

Вярхоўны суд разгледзеў скаргу незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» да ўпраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму. Калегія Вярхоўнага суду пад старшынствам судзьдзі Самалюка пакінула ў сіле рашэньне аб адмове ў рэгістрацыі.

### А. Мілінкевіч: «Продаж Velcom нанёс шкоду дзяржаве на 400 млн даляраў»

Былы кандыдат у прэзыдэнты зьвяртае ўвагу на тое, што грамадзтва зь вялікай занепакоенасьцю «назірае за фактамі непразрыстага і нікім не кантраляванага продажу дзяржаўных прадпрыемстваў і пакетаў акцыяў». «Продаж дзяржаўнага пакету акцыяў УП «Мабільная лічбавая сувязь» (Velcom) адбываўся за зачыненымі дзьвярыма і нанёс шкоду бюджэту нашай краіны ў памеры да 400 мільёнаў даляраў». «Такая прыватызацыя не ў інтарэсах усёй краіны, а асобных уладных груповак», — мяркуе А.Мілінкевіч.

**ЗП; МБ**

# Мала малака

Мінсельгасхарч прапануе павялічыць закупныя цэны на малако, перад абліччам малочнага дэфіцыту.

У галоўным упраўленьні эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчу неабходнасьць падвышэньня закупачных цэнаў тлумачаць адмоўнай рэнтабэльнасьцю вытворчасьці малочнай прадукцыі, што выклікана ростам выдаткаў. Акрамя таго ў міністэрстве прызналі, што на такі крок падштурхоўвае таксама цэнавы фактар у суседніх краінах, паведамляе БелТА. Варта адзначыць, што ўзьнік дэфіцыт малака ў сталічных крамах.

Вытворцы малака, сыроў і масла аддаюць перавагу экспарту ў Расею, дзе цэны на малочнае нашмат вышэйшыя. Гэта тлумачыцца таксама высокімі цэнамі на малочнае ў краінах ЭС.

**Сямён Печанко**

# Пастка для прыватных перапрацоўшчыкаў мяса

Імпарт сыравіны дазволены толькі з Расеі.

Ад 17 сакавіка ў Беларусі дзейнічае ініцыяваная Мінсельгасхарчам забарона імпарту мяса. Рэзыдэнты СЭЗ, што спэцыялізуюцца на перапрацоўцы мяса, вымушаны ад сакавіка набываць толькі айчынную сыравіну. У пачатку мінулага месяцу яны сутыкнуліся з дэфіцытам сьвініны, што адбілася на аб’ёмах вытворчасьці, паведамляе эканамічны тыднёвік «Белорусы и рынок». Берасьцейскае прадпрыемства «Інка-Фуд» у жніўні скараціла вытворчасьць амаль у тры разы супраць заплянаванага, а прадпрыемства «Інка» спынілася. Праблемы назіраюцца ў СЭЗ Горадні і Віцебску.

Паводле экспэртаў, дэфіцыт сьвініны выкліканы выгаднымі ўмовамі ў суседняй Расеі, дзе назіраецца рэзкі рост попыту і закупных цэнаў. У такой сытуацыі забесьпячэньне сыравінай прыватных прадпрыемстваў падаецца непрыярытэтным, лічаць у Мінсельгасхарчы.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Экспэрты ў сваю чаргу лічаць частковы дазвол на імпарт з Расеі нявыгаднымі. Дазвол імпарту з краінаў ЭС на іх думку больш выгадны — з заходнімі партнэрамі наладжаныя сувязі, набываць сыравіну ў іх таньней. У Польшчы мяса каштуе таньней, чым у Беларусі.

**Сямён Печанко**

# Балтыйскі вэктар

Таваразварот паміж Беларусьсю і Латвіяй дасягнуў $647 млн., што складае 214% ад мінулага году.

Памер прыцягнутых латыскіх інвэстыцыяў у беларускую эканоміку павялічыўся да $70 млн., зь іх наўпроставыя інвэстыцыі склалі $18 млн.

«Мы і найдалей будзем вітаць удзел латыскага бізнэсу ў беларускіх інвэстыцыйных праграмах і праектах» — заявіў на адкрыцьці трэцяга беларуска-латыскага фінансава-інвэстыцыйнага форуму ў Рызе пасол Беларусі ў Латвіі Аляксандар Герасіменка. Па яго словах, да канца бягучага году таваразварот між нашымі краінамі можа дасягнуць $1 млрд. Для параўнаньня, таваразварот паміж Беларусьсю і Расеяй за першыя шэсьць месяцаў 2007 г. вырас на 22,1% і склаў $13,4 млрд. Да канца году ён можа ўзрасьці да $20 млрд.

У апошнія гады гандлёва-эканамічныя адносіны паміж Беларусьсю і яе паўночнымі суседкамі заўважна ажывіліся. Варта нагадаць, што на мінулым тыдні прэм’ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі наведаўся з візытам у Літву, дзе меў сустрэчу са сваім літоўскім калегам Гедымінасам Кіркіласам. У часе сустрэчы літоўскі бок паведаміў пра гатоўнасьць інвэставаць у беларускую эканоміку каля $1 млрд. Найперш беларускі ўрад цікавіць пытаньне выкарыстаньня марскіх партоў Літвы і Латвіі дзеля транзыту нафты з Вэнесуэлы, а таксама магчымасьць удзелу Беларусі ў пабудове АЭС у Ігналіне.

**СП**

## СЬЦІСЛА

### Міжнародныя рэзэрвовыя актывы вырасьлі на 55,8%

Міжнародныя рэзэрвовыя актывы Беларусі павялічыліся за студзень-верасень на $771,9 млн., або на 55,8%, і склалі $2154,8 млн. У верасьні рост рэзэрваў склаў 17,3%. Найбольшую ўдзельную вагу займаюць рэзэрвовыя актывы ў замежнай валюце — $1886,3 млн. (87,5%) і манэтарнае золата — $185,7 млн., (8,6%). Разьлік праводзіўся паводле мэтодыкі МВФ. Аднак рэзэрвы пакуль складаюць толькі крыху болей за месячны аб’ём імпарту. У большасьці краінаў стандарты нацыянальнай бясьпекі абавязваюць мець рэзэрвы ў памеры трохмесячнага імпарту.

### Белтэлекам дэманапалізуюць

Рыхтуецца праект закону аб унясеньні зьмяненьняў і дапаўненьняў у «Закон аб электрасувязі», прыняты ў 2005 г. Ён прадугледжвае адмену манаполіі «Белтэлекаму» на аказаньне некаторых відаў паслугаў сувязі, а таксама ўвядзеньне добраахвотнай сэртыфікацыі паслугаў сувязі для дробных апэратараў, што не займаюць дамінуючае становішча на беларускім рынку і прапануюць унікальныя паслугі. Зьмены на рынку сувязі зьяўляюцца адной з умоваў уступленьня Беларусі ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю. Ня варта чакаць поўнай лібэралізацыі рынку сувязі. Ліквідацыя манаполіі «Белтэлекаму» прадугледжваецца толькі ў выпадках, калі яна стрымлівае разьвіцьцё рынку паслугаў сувязі, паведаміў намесьнік міністра сувязі.

**СП, паводле БелТА**

# Банду Марозава паўторна асудзілі да расстрэлу

Завяршыўся другі працэс над «бандай Марозава», якая дзейнічала ў Гомельскай вобласьці каля дзесяці гадоў. Калегія Вярхоўнага суду асудзіла С.Марозава і І.Данчанку да вышэйшай меры пакараньня — расстрэлу.

Іх прызналі вінаватымі ў некалькіх забойствах. Бандытаў В. Зайцава, А.Семчанку, Д.Сідарэнку, А. Астрацова-Гутыру асудзілі на 20 гадоў зьняволеньня, зь якіх 5 гадоў яны адбудуць у турме, а 15 у калёніі. А.Джумаў асуджаны на 6 гадоў.

Гэта ўжо другі працэс над С.Марозавым і ягонымі саўдзельнікамі. У сьнежні 2006 г. быў вынесены першы прысуд. Тады да сьмяротнага пакараньня былі асуджаныя С.Марозаў, І.Данчанка і В.Гарбаты.

Працэс праходзіў у менскім сьледчым ізалятары за зачыненымі дзьвярыма. Прадстаўнік пракуратуры Эльдар Сафараў патлумачыў закрытасьць працэсу «неабходнасьцю гарантаваць бясьпеку ўдзельнікаў працэсу». Сваякоў асуджаных не пусьцілі нават на агалошваньне прысуду.

Паводле Э.Сафарава, ніхто з асуджаных за забойства не прызнаў сябе вінаватым. Прадстаўнік пракуратуры паведаміў, што працягваюцца пошукі былых супрацоўнікаў праваахоўных органаў, якія ўваходзілі ў банду С.Марозава і схаваліся пасьля яго арышту.

**Радыё «Свабода»**

# Ва ўласьнікаў 487 катэджаў запатрабаваныя дэкларацыі

Уладальнікі дарагіх катэджаў павінны падаць дэкларацыі аб прыбытках. Пра гэта заявіў старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю Менскай вобласці Уладзіслаў Цыдзік. «Адкуль у чалавека зьявіліся сотні тысяч даляраў? Раней багатыя князі будавалі свае замкі стагодзьдзямі. А цяпер палац, які ні ў чым не саступае вядомым палацам, узводзіцца за адзін сэзон!» — заявіў службовец. — «Мы запатрабавалі 487 падатковых дэкляарацый, апрацавалі 90 — усе знаходзяць аргумэнты, знаходзяць нейкую прыбытковую частку, сьцьвярджаюць, што грошы ўзялі ў пазыку. Мы праверым і пазыкадаўцаў — адкуль у грамадзян такія сродкі? Мы пастараемся даказаць, што выдаткі некаторых грамадзян на гэтую нерухомасьць не адпавядаюць прыбыткам, якія ўказаныя ў падатковых дэкляарацыях. Падключацца АБЭЗ, ДФР».

Публікацыя гэтай навіны выклікала зьедлівыя камэнтары ў Інтэрнэце: а адкуль грошы на шыкоўныя катэджы ў лукашэнкаўскіх чыноўнікаў, якія жывуць у Драздах, знакамітым пасёлку насупраць Унівэрсытэту фізычнай культуры? Ці зьбіраецца сп.Цыдзік запрашваць ва ўладальнікаў чыноўніцкіх катэджаў падатковыя дэклярацыі?

**МБ**

# Гаўла «культурна» павіншавалі

Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія не забылася, што ў вядомага палітыка і пісьменьніка, былога прэзыдэнта Чэхіі Вацлава Гаўла 5 кастрычніка быў дзень народзінаў. У радыёвыпуску «Ранішні эскіз» каналу «Культура» вядоўца Вольга Гальпяровіч (дачка Навума Гальпяровіча, аднаго з кіраўнікоў дзяржаўнага радыё) узгадала пра дзень народзінаў Гаўла. Пасьля згадкі пра ягоныя дасягненьні ў палітычнай і культурніцкай сфэры прагучала літаральна наступнае: «Цяпер ён (Гавал) падпісвае заявы, складзеныя прафэсійнымі антысавецчыкамі і русафобамі». «Мне сорамна за гэта», — зрэагаваў на тое Генадзь Бураўкін.

**bulletenonline.org**

## СЬЦІСЛА

### Беларусы хочуць купляць у гіпэрмаркетах і працаваць у офісах

Замежныя экспэрты лічаць беларускі рынак камэрцыйнай нерухомасьці надзвычай пэрспэктыўным.

Фаза ягонага маруднага разьвіцьця зьмяняецца фазай паскоранага разьвіцьця, перадае словы прадстаўніка кампаніі Colliers International у краінах Балтыі і Беларусі Міхаіла Марозава газэта «Белорусы и рынок».

На думку сп. Марозава, у Беларусі высокі попыт на офісныя і гандлёвыя цэнтры. Расьце цікавасьць да беларускага рынку і з боку замежных кампаніяў, найперш тых, што працуюць у сфэры высокіх тэхналёгіяў, банкаў і страхаваньня. Рост плацежаздольнасьці беларусаў падвышае попыт на паслугі і падштурхоўвае разьвіцьцё гандлю. Гэта прыводзіць да таго, што форма гандлю паступова зьмяняецца — усё больш запатрабаванымі робяцца супэрмаркеты і гандлёва-забаўляльныя цэнтры. І гэта характэрна ня толькі для сталіцы, але й для абласных цэнтраў і буйных гарадоў.

### У ганаровую роту менчукоў не бяруць

Цяпер у складзе роты ганаровай варты менчукоў фактычна няма. Менскі ваенны камэндант, палкоўнік Анатоль Грыцаў, тлумачыць, што «менчукі, на жаль, слабыя здароўем. Мы падбіраем па першай ступені прыгоднасьці — гэта нават вышэй за ўзровень вайскоўцаў сіл спэцыяльных апэрацыяў». Другая праблема: «Побач з кіраўніком дзяржавы, замежным госьцем высокага ўзроўню ня можа стаяць чалавек, які зробіць штосьці неадэкватнае».

### Праезд Берасьце—Менск—Ворша стане платны

Праз недахоп сродкаў на рамонт галоўнай аўтамагістралі Беларусі, гэтак званай «алімпійкі», будзе ўведзеная аплата за праезд для грамадзянаў Беларусі. Да гэтага плацілі толькі замежнікі. Магістраль ад Берасьця да расейскай мяжы мае працягласьць амаль 610 кілямэтраў. Аднаразовая аплата за праезд можа складаць каля тысячы рублёў. Аднак на аўтамагістралі чатыры пункты збору аплаты. На кожным трэба плаціць асобна. У выніку беларусы будуць вымушаныя заплаціць 4 тысячы рублёў.

**СП**

# Затрыманьні перад Маршам




### У Менску

Рэгіянальнага лідэра **Зьмітра Барodку**, прадпрымальніка **Леаніда Навіцкага** і праваабаронцу **Сьвятлану Гарохавік** 1 кастрычніка затрымалі, зьвінаваціўшы ў нецэнзурнай лаянцы і далі па 15 сутак арышту на Акрэсьціна. Там жа знаходзяцца актывісты грамадзянскай кампаніі «За свабоду» **Ігар Балыкін** ды **Ігар Цішко**.

Заяўнік «Эўрапейскага маршу» **Яўген Афнагель** 8 кастрычніка быў асуджаны Цэнтральным судом Менску на 10 сутак арышту. Яўгена затрымалі акурат пасьля таго, як ён выйшаў зь Менгарвыканкаму, дзе ён удзельнічаў у перамовах з гарадзкімі ўладамі з нагоды правядзеньня «Маршу».

У **Аляксандра Атрошчанкава** 9 кастрычніка міліцыянты шукалі труп, але ў выніку канфіскавалі друкаваную прадукцыю (шукалі ўлёткі да «Маршу») і сыстэмны блёк кампутара, а гаспадара тэхнікі арыштавала.

### У Горадні

9 кастрычніка ў мясцовым наркадыспансэры сустрэліся кіраўнік абласной арганізацыі БСДГ **Віктар Сазонаў** ды кіраўнік абласной арганізацыі АГП **Юры Істомін** з сваім аднапартыйцам **Зьмітром Слуцкім**. Усіх траіх туды прывезьлі міліцыянты. Але асудзілі палітыкаў за «лаянку». Хутка да іх далучыўся актывіст грамадзянскай кампаніі «За Свабоду» **Іван Роман**. Істоміна, які 5 кастрычніка выйшаў з-за кратаў пасьля пяцідзённага арышту, асудзілі на 7 сутак, астатніх — на 5. Арыштаваныя абвясьцілі галадоўку. А вось кіраўніка гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ **Вадзіма Саранчукова**, калі за ім у кватэру пагналіся міліцыянты, адбіла жонка і зараз ён на свабодзе.

### У Віцебску

Каб «выпадкова» не мацюкнуцца ў часе затрыманьня, віцебскі апазыцыянэр актывіст Руху «За Свабоду» **Сяргей Парсюкевіч** заляпіў сабе рот скотчам.

### У Гомелі

Старшыню Гомельскай абласной арганізацыі АГП **Васіля Палякова** судзьдзя Чыгуначнага раёну **Яраслаў Парэмскі** асудзіў на 7 сутак арышту нібыта за лаянку. Палякову не залічылі каля 15 гадзінаў, якія той правёў у міліцыі й ізалятары часовага ўтрыманьня. У судзе супраць яго сьведчыла **Натальля Пруднікава**, супрацоўніца ідэалягічнага аддзелу адміністрацыі Чыгуначнага раёну Гомелю.

Машыну каардынатара руху «За Свабоду» **Уладзімера Кацоры** спыніла ДАІ, а пасля ў пастарунку на яго быў складзены пратакол нібыта за нецэнзурную лаянку. Гомельскі суд пакараў сп. Кацору 7 суткамі адміністрацыйнага арышту.

### У Нясьвіжы

На **Насту Азарку** 9 кастрычніка міліцыянты склалі пратакол за расклейваньне налепак. Суд мае адбыцца ў канцы кастрычніка.

**СП**

### 1 кастрычніка

### На суткі за раздачу газэты

Шэсьць сябраў гарадзенскай абласной філіі АГП былі затрыманыя ў часе раздачы газэты «Свабода Беларусі» на гарадзкіх рынках. Кіраўніка абласной арганізацыі **Юрыя Істоміна** і яго намесьніка **Андрэя Янушкевіча** пакінулі на ноч у пастарунку. Суд Ленінскага раёну Горадні пакараў А. Янушкевіча штрафам у памеры 3 базавых велічынь. Ю.Істомін у судзе Кастрычніцкага раёну атрымаў 5 сутак адміністарацыйнага арышту.

### 2 кастрычніка

### Клімаў застанецца за кратамі

Менскі гарадзкі суд пакінуў бязь зьменаў прысуд палітзьняволенаму **Андрэю Клімаву**. Наступныя два гады ён правядзе ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Апазыцыянэр абвінавачваецца ў закліках да зьвяржэньня дзейнай улады. Судовы працэс адбываўся за зачыненымі дзьвярыма, у залю былі дапушчаныя жонка Клімава Тацяна й адвакат. Гэта трэці па ліку крымінальны прысуд супраць А. Клімава.

### 3 кастрычніка

### Да чытача праз міліцыю

Раніцай непадалёк ад расейска-беларускай мяжы супрацоўнікі дзяржаўтаінспэкцыі затрымалі наклады газэтаў **«Товарищ»** і **«Народная воля»**, што везьлі ў Беларусь са Смаленску. У Дубровенскім РУУС у прысутнасьці начальніка міліцыі наклады газэт зьверылі з дадзенымі тавар-на-транспартных накладных. Пасьля гэтага аўто з газэтамі адпусьцілі.

### 5 кастычніка

### Севярынцу адмовілі

Берасьцейскі абласны суд не задаволіў скаргу **Паўла Севярынца** на рашэньне суду Маскоўскага раёну Берасьця, які прысудзіў палітыка да 15 сутак арышту «за парушэньне ўстаноўленага парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў паўторна на працягу году». Таксама абласны суд пакінуў безь зьмяненьняў рашэньне суду ніжэйшай інстанцыі ў адносінах да двух удзельнікаў сустрэчы з П.Севярынцам, што прайшла ў Берасьці 19 жніўня, — **Юрася Бакура**, які быў аштрафаваны на 3 базавыя велічыні, а таксама **Любові Праневіч** (ёй было вынесена папярэджаньне).

###Ператрэсьлі гомельскую АГП

У Гомелі супрацоўнікі УКДБ наладзіліператрус на офісе абласной арганізацыі АГП.Ператрус ладзілі супрацоўнікі КДБ капітан **Андрэй Юрэвіч** і маёр **Юры Назарэнка**, якія прад'явілі санкцыю пракурора Гомельскай вобласьці **Алега Палавінкі**. Супрацоўнікі КДБ патлумачылі, што сьледчыя мерапрыемствы на офісе АГП адбываюцца ў рамках крымінальнай справы, заведзенай у дачыненьні асобаў, што дзейнічаюць ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт».

### Саўмін недатыкальны

Вышэйшы гаспадарчы суд адхіліў скаргу Беларускага Хэльсынскага камітэту на Савет міністраў і Міністэрства фінансаў. Прадстаўнік Саўміну на разгляд справы нават не зьявіўся. Нагадаем, тры гады таму БХК абклалі падаткам на замежную дапамогу паводле праграмы TACIC. Між тым, раней з гэтай дапамогі падатак ня бралі. Улада патлумачыла новаўвядзеньне зьменамі ў закон аб падатках-абкладаньні, якія ўнёс парлямэнт.

Арыштаваную маёмасьць БХК ацанілі ў 250 тыс. руб. Адначасова суд пастанавіў спагнаць з арганізацыі 155 мільёнаў рублёў падаткаў і штрафаў за іх няўплату. Рахунак БХК арыштавалі, а супраць яе кіраўнікоў завялі крымінальную справу. Потым яе закрылі, але старшыня БХК **Тацяна Працька** не выключае, што справу ў любы момант могуць аднавіць.

### Свабоду прэсе

УСмалявічах у цэнтральным сквэры прайшла акцыя ў падтрымку незалежнай прэсы пад назвай «Чытаем свабодную прэсу». Тузін актывістаў грамадзянскай кампаніі «За Свабоду» дэманстратыўна чыталі газэту «Свабода». Па заканчэньні акцыі міліцыянты затрымалі восем чалавек. Праз гадзіну маладых людзей вызвалілі, газэты сканфіскавалі.

### Шукалі ўгнаеньні

У Сьветлагорску міліцыя правялаператрус у кватэры мясцовага актывіста **Тэльмана Масьлюкова**. Участковы інспэктар, старшы лейтэнант **Дзяніс Каткавец** і сьледчы, лейтэнант **Дзьмітры Казак** шукалі кайстры зь мінэральнымі ўгнаеньнямі ў кніжных шафах. Раней сваяк Масьлюкова фігураваў у справе крадзяжу мінэральных угнаеньняў. Тады справу спынілі за адсутнасьцю складу злачынства. Варта нагадаць, што ў верасьні Т. Масьлюкова выклікалі на допыт у КДБ паводле крымінальнай справы «Маладога фронту».

## Кастрычнік — месяц смутку і памяці для беларускіх і расейскіх журналістаў

**Роўна год таму, 7 кастрычніка 2006 году, у Маскве была застрэленая журналістка «Новой газеты», праваабаронца Ганна Паліткоўская. Тры гады таму, 20 кастрычніка 2004 г., у Менску забілі журналістку газэты «Салідарнасьць» Вераніку Чаркасаву.**

Абедзьве жанчыны былі пазбаўленыя жыцьця ва ўласных дамах, зь дзікунскай жорсткасьцю і цынізмам. Абедзьве журналісткі пісалі на «нязручныя» для ўладаў тэмы, што дазваляе грамадзкасьці казаць пра палітычныя матывы забойстваў. Абодва злачынствы дагэтуль застаюцца нераскрытымі.

Таму кастрычнік — гэта яшчэ і месяц пытаньняў, якія задаем мы, калегі Веранікі і Ганны:

Чаму нашы журналісты гінуць у мірны час, ва ўласных дамах?

Чаму рассьледаваньні гэтых справаў выклікаюць усё больш пытаньняў і не даюць адказаў?

Хто стаіць за гэтымі забойствамі, спрабуючы запалохаць нас?

Патрабуем праўды!

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», Цэнтар экстрэмальнай журналістыкі Саюзу журналістаў Расеі**

# Цёмная матэрыя

Старадаўнія рэлігійныя ўяўленьні пра бясконцае змаганьне сьветлага й добрага пачаткаў, можна сказаць, знайшлі свае экспэрымэнтальнае пацьверджаньне ў фізыцы. Піша **Віталь Тарас**.

Пакуль у Расеі ўсур’ёз рыхтуюцца ўводзіць «асновы праваслаўя» для малодшых клясаў, Рада Эўропы пастанавіла рэкамэндаваць усім навучальным установам цалкам адмовіцца ад выкладаньня тэорыі боскага паходжаньня сьвету (крэацыянізму) як ненавуковай. Насамрэч, праблема (калі лічыць гэта праблемай), палягае на тым, што карціна Сусьвету, атрыманая на падставе сучасных навуковых зьвестак, выглядае куды больш складанай, а галоўнае — куды больш цікавай.

## «Дзірка» ў Сусьвеце

Які школьнік сёньня ня ведае тэрміну «Вялікі Выбух»! Яго ўвёў у навуковы ўжытак у 1946-м амэрыканскі фізык, тройчы ляўрэат Нобэлеўскай прэміі Георгій Гамаў (былы савецкі навуковец, які зьбег з СССР у 1933-м). Паводле ягонай тэорыі, якая абапіралася на тэорыю адноснасьці Айнштайна, Сусьвет узьнік 13 мільярдаў гадоў таму са звышшчыльнай субстанцыі са звышвысокай тэмпэратурай, і з таго часу ён бясконца пашыраецца і астывае. Гамаў прадказаў таксама адкрыцьцё так званага «рэліктавага выпраменьваньня» у космасе — адгалоскаў пачатку Вялікага Выбуху.

У 1978 годзе Нобэлеўскую прэмію за экспэрымэнтальнае пацьверджаньне тэорыі Гамава атрымалі Арно Пэнзіяс (немец, які зьбег у ЗША зь гітлераўскай Нямеччыны) і амэрыканец Робэрт Уілсан. Пазьней быў створаны спадарожнік WMAP (мікрахвалевы анізатропны тэстэр Уілкінсана), які назірае за тым самым рэліктавым выпраменьваньнем. Дык вось, нядаўна гэты спадарожнік выявіў гіганцкую «дзірку» ў сузор’і Эрыдана. У гэтай дзірцы памерам «усяго» ў дзесяць тысячаў мільярдаў кілямэтраў, няма анічога — нават рэліктавага мікрахвалевага выпраменьваньня. Абсалютны нуль.

Між тым, гэтае фантастычнае адкрыцьцё пацьвярджае тэорыю аб існаваньні так званай цёмнай матэрыі. (Паняцьце, якое першым прапанаваў Айнштайн). На думку навукоўцаў, яна павінна была быць на першых этапах існаваньня Сусьвету. Паводле экспэрымэнтальных разьлікаў, адразу пасьля Вялікага Выбуху разам з матэрыяй узьнікла й антыматэрыя (сынонім «цёмнай матэрыі»), якая выконвала ролю магніту для першых зорак. Дзякуючы цёмнай матэрыі, можна сказаць, Сусьвет і разагрэўся.

Галоўны парадокс у тым, што для назіральніка, нават узброенага прыборамі, цёмная матэрыя практычна незаўважная — яна не выпраменьвае сьвятла ці радыяцыі, яна мае толькі сілу прыцягненьня. Дакладней — антыгравітацыі.

## 4%

Большасьць сучасных фізыкаў сыходзяцца на тым, што доля антырэчыва ў Сусьвеце складае каля 96 адсоткаў яго аб’ёму і масы. «Мы лічым, што разумеем Сусьвет, але на самай справе мы гаворым толькі пра чатыры яго адсоткі», — сказаў неяк ляўрэат Нобелеўскай прэміі па фізыцы 1980 году Джэймс Уотсан Кронін. Паводле ягоных словаў, 73% Сусьвету складае цёмная энэргія — гіпатэтычная форма энэргіі, якая мае адмоўны ціск і якая раўнамерна запаўняе ўсю прастору. Яшчэ 23% — цёмная матэрыя, нераспазнаны матэрыял, які мацуе Ўнівэрсум і паскарае яго пашырэньне. 4% атамаў і малекулаў складаюць так званую нармальную матэрыю, альбо, кажучы словамі выкладчыкаў навуковага камунізму, «аб’ектыўную рэальнасьць, дадзеную нам у адчуваньнях…»

Цёмную матэрыю нельга выявіць ніякім чынам, нават з дапамогай прыбораў. Аднак яе прысутнасьць можна давесьці, бо пад яе ўзьдзеяньнем скрыўляецца выпраменьваньне далёкіх галяктык. Мы можам пераканацца ў існаваньні цёмнай энэргіі на прыкладзе іх разьбяганьня. Прычым, разьбяганьне, як выявілі астрафізыкі, парадаксальным чынам адбываецца з усё большым паскарэньнем, насуперак сілам гравітацыі.

Сёньня ёсьць дзьве асноўныя гіпотэзы, пабудаваныя на падставе тэорыі Вялікага Выбуху. Першая: Сусьвет, дасягнуўшы максымальнага памеру, «схлопваецца», пасьля чаго адбываецца новы выбух. То бок, Сусьвет як бы бясконца пульсуе. Другая: Сусьвет пашыраецца бясконца. Зразумела, сіламі сёньняшняй навукі немагчыма сканструяваць кампутарную мадэль Унівэрсуму. Для таго, каб ацаніць правільнасьць тае або іншай гіпотэзы, трэба было б пражыць, прынамсі, некалькі мільярдаў гадоў.

Але выглядае на тое, што старадаўнія рэлігійныя ўяўленьні пра бясконцае змаганьне сьветлага й добрага пачаткаў, можна сказаць, знайшло свае «экспэрымэнтальнае» пацьверджаньне. Праўда, усё залежыць ад становішча назіральніка — «цёмнае» й «сьветлае» могуць мяняцца на свае процілегласьці: з гледзішча прадстаўніка «нармальнай» матэрыі і з гледзішча прадстаўніка матэрыі «цёмнай» усё можа бачыцца інакш.

## Ня сьнілася нашым мудрацам

Жарты жартамі, але прагрэс у галіне астрафізыкі за апошнія дзесяцігодзьдзі сапраўды ўражвае. Калі зусім нядаўна гэтую навуку параўноўвалі з палеанталёгіяй (бо бачны нам Сусьвет ёсьць, насамрэч, карцінай Вялікага Выбуху на момант некалькіх мільёнаў гадоў таму), дык сёньня астрафізыка апэруе экспэрымэнтальнымі зьвесткамі й кампутарнымі мадэлямі. Навукоўцы прадказваюць, што ў бліжэйшыя гады будуць экспэрымэнтальным шляхам выяўленыя «антычасьцінкі», якія кардынальна адрозьніваюцца па сваёй прыродзе ад вядомых нам барыёнаў (пратонаў, нэўтронаў, нэўтрына і г.д.)

Цікава, аднак, што ў той самы час у галіне дасьледаваньня чалавека — у прыватнасьці, вывучэньня законаў дзейнасьці яго цэнтральнай нэрвовай сыстэмы і псыхікі — навука прасунулася наперад (калі ўвогуле прасунулася) куды менш. Дастаткова сказаць, што ў галіне фізыялёгіі й мэдыцыны Нобэлеўскую прэмію за адкрыццё мэханізму ўмоўных рэфлексаў фізыёляг Іван Паўлаў атрымаў ажно ў 1904 годзе. А Роджэр Спэры за адкрыццё функцыянальных адрозьненьняў паўшар’яў галаўнога мозгу атрымаў Нобэля толькі праз 77 гадоў. Ні да, ні пасьля гэтага вялікіх адкрыццяў у галіне вышэйшай нэрвовай дзейнасьці адзначана не было — прынамсі, Нобэлеўскім камітэтам. Ці азначае гэта, што прынцыпы дзейнасьці галаўнога мозгу чалавека ўжо цалкам вывучаная і ніякіх адкрыццяў у гэтай галіне чакаць ня сьлед? Наўрад ці.

Але на сёньняшні дзень інтэлектуальны, творчы, а галоўнае, маральны бок дзейнасьці homo sapiens выглядаюць суцэльнай загадкай.

Якім навуковым спосабам можна патлумачыць, напрыклад, той факт, што фізык родам зь Беларусі Жарэс Алфёраў, нобэлеўскі ляўрэат 2000 году (за вывучэньне паўправаднікоў), адзін з падпісантаў знакамітага ліста дзесяцёх акадэмікаў РАН супраць абавязковага выкладаньня праваслаўя ў навучальных установах, пагадзіўся ўвайсьці ў сьпіс Кампартыі Расейскай Фэдэрацыі на сёлетніх выбарах у Думу? Акадэмік Алфёраў пазначаны ў фэдэральным выбарчым сьпісе другім нумарам, адразу ўсьлед за лідэрам КПРФ Зюганавым, які нядаўна выступіў у падтрымку…таго самага выкладаньня Закону Божага ў школах. Гэтую прапанову РПЦ Зюганаў назваў слушнай, бо, на яго думку, «праваслаўная культура ляжыць у аснове разьвіцьця» Расеі.

Магчыма, тлумачэньне падобных фэномэнаў трэба шукаць недзе ў глыбінях цёмнае матэрыі?


# Пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




падпісны індэкс 00345

# Неверагодныя прыгоды ўкраінцаў у Беларусі

Украінскі грамадзянін сьцьвярджае, што беларускае ДАІ жорстка зьдзекавалася зь яго і ягонай сям'і.



**Сям'я дэсантніка Аляксеенкі.**

Жыхар Белай Царквы (Кіеўская вобласьць) Рыгор Аляксеенка 2 жніўня прыехаў зь сям'ёй у Віцебск, на сустрэчу з былымі саслужыўцамі. Мерапрыемства праходзіла ў 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі. Праводзіўся і конкурс вайскова-патрыятычнай песьні, у якім удзельнічала 13-гадовая дачка Настасься. Пасьля ўрачыстасьцяў яны выправіліся дахаты. Машыну вяла жонка Кацярына.

Калі да мяжы заставалася кілямэтраў сорак, падзеі сталі разгортвацца, як у дэтэктыве.

— Было ўжо поначы, вакол лес. І тут нашу машыну спыняюць людзі, апранутыя ў форму супрацоўнікаў ДАІ, — расказвае Рыгор Аляксеенка. — Інспэктар паведаміў, што кіроўца перавысіў хуткасьць, і простым тэкстам сказаў: вы «папалі на бабкі». Жонка стала пярэчыць, на што ёй было прапанавана заплаціць 100 даляраў і валіць прэч. Але мы не зьбіраліся плаціць! Бо гэта значыла б прызнаць сваю віну, а мы ніякіх правілаў не парушалі. Што мая жонка і заявіла міліцыянту. У адказ такое панеслася… Ён абазваў яе «хахляцкай прастытуткай» — і гэта ў прысутнасьці дачкі! Я папрасіў даішнікаў паводзіцца прыстойна. Тады адзін зь міліцыянтаў выцягнуў пісталет з словамі: «Я табе зара пушчу кулю ў лоб і пристрэлю, як сабаку. Як польскія паліцыянты прыстрэлілі хахла» (Відавочна, мелася на ўвазе забойства грамадзяніна Украіны Сяргея Кудры, застрэленага ў 2001 г. на вачах у цяжарнай жонкі — **«Факты».**)

— Вы ўпэўненыя, што гэта была міліцыя? Можа, нехта на дарозе разбойнічаў…

— Акурат гэтага мы і спалохаліся! Падумалі, што маем справу зь пераапранутымі бандытамі. Таму, скарыстаўшыся паўзай, ускочылі ў машыну і паімчалі ў людное месца —да прапускнога пункту «Новая Гута».

— Дагналі нас толькі на прапускным пункце. Пад'ехалі ажно тры міліцэйскія аўтамабілі. Жонку і дачку выцягнулі з машыны і абышліся, як зь небясьпечнымі злачынцамі: рукі на капот, ногі на шырыню плячэй. Дачку пару разоў выцялі галавой аб машыну, міліцыянт піхнуў яе нагой… Мяне спрабавалі выцягнуць з аўто, але калі я ўбачыў, што чыняць з маімі блізкімі, выскачыў сам. І, натуральна, атрымаў сваё. Пазьней, калі нам выклікалі хуткую дапамогу, у мяне зафіксавалі цялесныя пашкоджаньні, а дачку шпіталізавалі з дыягназам «выцён лобнай вобласьці».

На шум падняліся памежнікі. Памятаю, нехта зь іх крыкнуў: «Бі па нырках, каб сьлядоў не засталося». Мне закулі рукі ў кайданкі і мяне закінулі за сьпінку сядзеньня аўтамабіля.

Калі нас прывезьлі ў Гомельскі РУУС, падпалкоўнік міліцыі, які тады быў у дзяжурнай частцы, сказаў: «Вас, хахлоў, з вашай «памаранчавай» рэвалюцыяй трэба было расстраляць, як сабак. Машыну б пусьцілі пад адхон, яна б разам з вамі згарэла, і нам бы ніхто нічога не даказаў!» Калі з памяшканьня выйшлі практычна ўсе, адзін зь міліцыянтаў на свой страх і рызыку выклікаў «хуткую». Дачку забралі ў больніцу, аказалі дапамогу, пасьля чаго яна з жонкай вярнулася ў райаддзел.

Зьдзекі цягнуліся да 4 гадзінаў раніцы. Пасьля мяне пасадзілі ў машыну і зьвезьлі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. У ізалятары мяне зьмясьцілі ў бэтонную камэру да мясцовых бамжоў, папярэдне распрануўшы… дагала.

У жонкі забралі правы й наклалі штраф, эквівалентны 800 далярам. Машыну, праўда, удалося забраць… Мая дачка заявіла, што больш ніколі ў жыцьці не паедзе ў Беларусь.

— Звычайна іншаземцы, якія трапілі ў гісторыю за мяжой, спрабуюць зьвязацца з консульствам. Ці далі вам такую магчымасьць?

— Мне нават адваката не далі! Раніцай 4 жніўня, даставілі ў суд Гомельскага раёну, дзе прызналі вінаватымі паводле шэрагу артыкулаў: абвінавацілі ў дробным хуліганстве, супраціўленьні й абразе супрацоўнікаў міліцыі ў часе выкананьня імі службовых абавязкаў. Было прынята рашэньне спагнаць зь мяне 1 мільён 302 тысячы рублёў.

Калі сустрэліся ў верасьні ў Беларусі з украінскім консулам, я прапанаваў яму праехаць у маёй машыне, а не ў ягонай, з дыпляматычнымі нумарамі. Мы пабывалі ў даішнікаў, заехалі ў кавярню паабедаць і накіраваліся да Новай Гуты. З улікам папярэдняга сумнага досьведу, я быў вельмі асьцярожны, хоць і ехаў са звычайнай для сябе хуткасьцю 90 км/г. Мая машына абсталяваная сыстэмай «аўтакруіз», якая дазваляе аўтамабілю рухацца з зададзенай хуткасьцю. Што не зашкодзіла ДАІ зноў спыніць нас.

Міліцыянты прадэманстравалі нам радар, дзе былі зафіксаваныя чыесьці 140 кілямэтраў у гадзіну. Я вёў сябе вельмі спакойна, але мяне зноў пачалі абвінавачваць у хамстве і нецэнзурных выразах.

Пасьля таго, як падышлі й адрэкамэндаваліся консул і юрыст, міліцыянты зьехалі.

* * *

Газэта «Факты» зьвярнулася па камэнтар да консула Украіны ў Беларусі Васіля Сярдзегі, які быў адным з удзельнікаў сустрэчы на дарозе з супрацоўнікамі беларускага ДАІ.

— Ведаеце, у мяне склалася такое ўражаньне, што гэтая сустрэча была невыпадковай. Нібыта нехта падаслаў гэтых даішнікаў, каб мы цалкам упэўніліся ў словах Рыгора Аляксеенкі. Так што ўсё, што ён паведаміў у сваёй заяве на імя пракурора Гомельскай вобласьці, я пацьвярджаю. Справу Рыгора Аляксеенкі мы трымаем на кантролі. Зьбіраюся асабіста ўзяць удзел у паседжаньні 10 кастрычніка.

**Паводле ўкраінскай газэты «Факты»**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Малітва за паэтаў

была ў нядзелю ў Чырвоным касьцёле. Піша **Наталка Бабіна**.

У гэтую нядзелю ў менскім касьцёле Сьв. Сымона і Алены адбылася прэзэнтацыя кніг Рыгора Барадуліна: другога дапоўненага выданьня ўжо знакамітай кнігі «Ксты», зборніка вершаў «Быць!», кнігі перакладаў «Гуканьне паэзіі Ўсходу», а таксама выдадзенай у Японіі кнігі «Малітва ветру» (вершы Барадуліна ў перакладзе на японскую).

Самую працяглую частку прэзэнтацыі складала імша, падчас якой ксёндз-пробашч касьцёла Ўладыслаў Завальнюк заклікаў прысутных маліцца за «настаўнікаў людзей» — беларускіх паэтаў ды пісьменьнікаў, а самім пісьменьнікам пажадаў «чыстай мовы ва ўсіх сэнсах гэтых словаў».

Людзей на імшу прыйшло шмат — памяшканьне было запоўненае, багата хто стаяў у праходах. Пасьля заканчэньня многія засталіся і на самую прэзэнтацыю. Чытачы ў народнага паэта самыя розныя: ад вельмі сталых бабулек у мілых хустачках да дагледжаных паняў бальзакаўскага ўзросту і хлопчыкаў-маладафронтаўцаў. «Прыйшоў па падпітку для душы, — сказаў мне Юрась С., сябра незарэгістраванай арганізацыі «Моладзь БНФ» — У чацьвер мяне маюць судзіць за «нецэнзурную лаянку ў грамадзкім месцы», рыхтуюся да найгоршага: думаю, пасадзяць на час правядзеньня «Эўрапейскага маршу». Залішне гаварыць, што сам выгляд Юрася пераканаўча сьведчыў пра тое, што гэты чалавек ніколі ня будзе брудзіцца лаянкай...

Людзі цёпла віталі свайго паэта. Пісьменьнік Валянцін Тарас казаў: «Што такое Барадулін? Барадулін — гэта мова. Барадулін — гэта слоўнік. Гэта — сьветапогляд і сьветаадчуваньне. Гэта — уся гісторыя народу!»

На імпрэзе прысутнічалі і дыплюматы. Часовы паверaны Японіі ў Беларусі спадар Кайкэ Такаюкі адзначыў, што Беларусь і Японія падобныя існаваньнем у абедзьвюх моцнай паэтычная традыцыі, і выказаў радасьць, што мае магчымасьць пазнаёміцца зь літаратурнымі багацьцямі Беларусі. Амбасадар Швэцыі Стэфан Эрыксан на вельмі чыстай і цёплай беларускай павіншаваў прэзэнтанта і сказаў, што быў бы рады больш чым хто, калі б менавіта Рыгора Барадуліна ўганаравала Нобэлеўскай прэміяй швэдзкая Акадэмія навук...

Сам паэт выглядаў троху стомленым, але шчыра ўдзячным. У сваім кароткім слове ён згадаў пра сустрэчу з Папам Янам Паўлам II і пра тое, як прыемна было чуць з вуснаў пантыфіка беларускую мову, а потым падзякаваў усім, хто яго чытаў і прачытае...

На прэзэнтацыі я набыла зборнік «Ксты», зь якім, да сораму свайго, не была раней знаёмая. І астатак дню правяла чытаючы. Міхась Скобла вельмі трапна назваў анталёгію беларускай паэзіі «Краса і сіла». Гэтыя словы, канечне, тычацца і вершаў Барадуліна. І яшчэ адно азначэньне скраду з інтэрвію, якое рабіў спадар Скобла з народным паэтам. Адказваючы на пытаньне, ці ёсьць розьніца, дзе чытаць вершы — у Доме літаратара ці ў касьцёле, паэт адказаў, што ў касьцёле больш адказна, напружана і ўдзячна. «Там нельга фальшывіць, выраблягцца, выстаўляць сябе. Памятаю надпіс у нейкім касьцёле: «Ціха! Бог блізка». І мяне ў храмах не пакідае адчуваньне, што Бог блізка».

Блізкасьць Бога — і блізкасьць сапраўднай паэзіі — адчулі многія з тых, хто быў у нядзелю ў Чырвоным касьцёле. Троху шкада, што прэзэнтацыя супала па часе з закрыцьцём міжнароднага паэтычнага фэстывалю «Парадак слоў», якое ў гэты ж час праходзіла ў музэі Багдановіча, і аматарам паэзіі даводзілася выбіраць паміж гэтымі двума мерапрыемствамі.

## Бабры затапілі радзіму Купалы

Бабры сталі прычынай паводкі ў вёсцы Вязынка Маладачанскага раёну. Праз плаціну, якую на рацэ пабудавалі зьвяры, затапіла дарогу. Бабровая плаціна сама па сабе няшкодная. Аднак, вада праз норы трапляе ў суседняе возера. Адтуль — у канал, размываючы адзіную дарогу на маленькі хутар. Тут жыве дванаццаць чалавек. Ні хуткая, ні пажарная, ні машына з газавымі балёнамі ўжо паўгоду ня можа праехаць.

## Ці бяруць хабар ДАІшнікі?

Апытаньне на сайце МУС засьведчыла: больш за палову рэспандэнтаў пэўныя, што супрацоўнікі ДАІ бяруць хабар. Станоўча адказалі 53,17% (1324) чалавек. 20,52% (511) рэспандэнтаў пэўныя, што раней ДАІшнікі бралі хабар стала, але цяпер робяць гэта радзей, бо пабойваюцца. А вось 17,35% (432) лічаць, што супрацоўнікі ДАІ бяруць хабар рэдка. Сярод апытаных 8,96% (223) складалі некіроўцы, але яны выказалі ўпэўненасьць, што хабар ДАІшнікі бяруць. Варыянт адказу «не бяруць хабар» увогуле ня быў прадстаўлены.

## Тэрапэўту пагражае 6 гадоў за даведку аб вызваленьні ад заняткаў

У Баранавічах адбыўся суд па справе лекара, якая абвінавачваецца ў хабарніцтве.

Маладую жанчыну, на ўтрыманні якой знаходзіцца дзіця, вінавацяць у атрыманні 30 даляраў ад студэнткі, якой нібыта была патрэбна даведка аб вызваленьні ад заняткаў.

Праўда, валюту пры затрыманьні міліцыянты не знайшлі. Мечаныя даляры апынуліся ў іншай супрацоўніцы паліклінікі. Студэнтка на суд не зьявілася, адшукаць яе не змаглі.

Тэрапэўт, якой пагражае 6 гадоў пазбаўленьня волі, прадаставіла суду даведку судмэдэкспэртызы. Дакумэнт сьведчыць, што на сьцёгнах і плячах жанчыны шматлікія крывападцёкі.

Паводле словаў лекара, яна атрымала іх падчас допыту, калі зь ёй груба абыходзіліся. Жанчына нават некалькі разоў страчвала прытомнасьць.

## Штанге патрэніруе трэнэраў

Галоўны трэнэр зборнай Беларусі па футболе Бэрнд Штанге 23 кастрычніка правядзе сэмінар для трэнэраў вышэйшай лігі. З імем Штанге зьвязваюць надзеі на выхад беларускага футболу на новы ўзровень.

## Беларус на чэмпіянаце сьвету па кампутарных гульнях

З 3 па 7 кастрычніка ў амэрыканскім Сыэтле прайшоў World Cyber Games (WCG). Беларусь на чэмпіянаце прадстаўляў Аляксандар Драмкоў зь Дзятлава. Чэмпіянат сьвету па кампутарных гульнях бярэ свой пачатак ад 2000 г. Ініцыятарам яго правядзеньня стала Паўднёвая Карэя. Прызавы фонд складае $500 000.

## Каштаны цьвітуць, бо паміраюць

У Менску на праспэкце Машэрава (былыя вуліцы Варвашэні, Ерусалімская, Дразда) цьвітуць каштаны. Як патлумачылі эколягі, гэта рэакцыя дрэваў, вырачаных на хуткую пагібель. Дрэвы паміраюць ад таго, што будаўнікі зьнялі саракасантымэтровы слой грунту, каб зрабіць заезд на паркоўку больш пакатым. Адкрыліся карані. Восем каштанаў ужо загінулі, 15 змагаюцца за жыцьцё. Яны выпусьцілі бутоны ў надзеі, што зьявіцца насеньне, якое працягне род.



**Міні-міс сьвету-2007 стала менская васьмікласьніца Ліяна Гумарава. Яна апярэдзіла 36 суперніц з розных краін. На конкурс, апроч песьні яна прадставіла ікебану з васількоў і рамонкаў.**

## У магілёўскай школе апячаталі разэткі

Менавіта так дырэктар магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў №1 Ніна Саленкіна вырашыла эканоміць электраэнэргію і тым самым прытрымлівацца энэргазьберагальнай Дырэктывы №3. Цяпер ужо нельга карыстацца электрычнымі чайнікамі і зараджаць мабільныя тэлефоны.

## Недарод грыбоў і яблыкаў

Прычына недароду грыбоў відавочная: сухое надвор'е. Нават калі б прайшлі дажджы, для грыбніцы патрэбна ня менш за 10 дзён, каб яна «адрэагавала». «Неўраджай» адбіўся на нарыхтоўках. Падасінавікі і бабкі прымаюцца ад насельніцтва па 1,5—2 тыс. рублёў за кілё, лісічкі — па 4—5 тыс., белыя грыбы — па 5—7 тыс. Неўраджай на яблыкі таксама адбіваецца на закупных цэнах. Апад бяруць па 350—400 рублёў, таварныя яблыкі (зьнятыя ўручную) — па 1—1,3 тысячы за кг.

## «Дохлая малпа» з Бабруйску на службе ў Крамля

Пракрамлёўскі рух «Нашы» адправіў у агітацыйны тур па расейскіх гарадах бабруйскі вандроўны тэатар «Дохлая малпа». Мэта туру — паказаць «сапраўдны твар расейскай апазыцыі». Сярод пэрсанажаў «спэктаклю» «Другая Расея» — Міхаіл Касьянаў, Гары Каспараў, Ірына Хакамада, Эдуард Лімонаў, Міхаіл Хадаркоўскі, Барыс Беразоўскі і арганізатар апазыцыі Дзядзя Сэм.

**МБ, СП, АК паводле БЕЛТА, Радыё Рацыя, Эўрапейскае радыё для Беларусі Менск-Навіны, АНТ, Звязда, s13.ru, БелаПАН, Польскае радыё для замежжа**

# Нацыя хоча адчуць сябе камандай

Посьпех беларускіх баскетбалістак параўноўваюць з з хакейнай удачай на Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці. Краіна прагне камандных перамог. Піша **Зьміцер Панкавец.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Яшчэ ніколі ў найноўшай гісторыі нашага спорту зборныя ў гульнявых відах не заваёўвалі мэдалёў на чэмпіянатах сьвету ці Эўропы. І гэтым разам у посьпех беларусак ніхто ня верыў. Тым больш, што на гэтае прэстыжнае спаборніцтва ў Італію каманда Анатоля Буяльскага ехала абсалютным дэбютантам. Нават на чэмпіянат зборная выйшла з другога месца ў адборачнай групе, саступіўшы грачанкам. Беларуская каманда глядзелася аўтсайдэрам у кампаніі гішпанак, сэрбак і харватак, зь якімі трапіла ў адну групу. І першы матч толькі пацьвердзіў пэсымістычныя прагнозы — саступілі гішпанкам практычна ва ўсіх кампанэнтах гульні.

Але пасьля здарыўся цуд: адна за адной былі разгромленыя бальканскія зборныя Сэрбіі і Харватыі. Нашы трапілі ў другі этап! Калі ўдасца перамагчы хаця б у адным з трох матчаў другога этапу, удасца зачапіцца за чвэрцьфінал. Адужаць мабільных француженак і магутных расіянак (яны сталі-такі пасьля чэмпіёнкамі) камандзе Анатоля Буяльскага не ўдалося. Стаўка рабілася на апошнюю гульню з гаспадынямі турніру — італьянкамі. Хоць трыбуны стадыёну ў Артэне раўлі, падтрымліваючы зямлячак, хоць судзейства было не заўжды аб’ектыўным (у спрэчных момантах судзьдзі часьцяком бяруць бок гаспадароў поля), беларускі даказалі, што яны мацнейшыя — 66:51.

Акрыленыя посьпехам беларускі літаральна зьмялі з дарогі чэмпіёнак Эўропы з Чэхіі, зь якімі давялося сустрэцца ў чвэрцьфінале. Настасься Верамеенка, Алена Леўчанка, Натальля Марчанка, Натальля Трафімава, Марына Крэс, Кацярына Сныціна, Сьвятлана Вольная даказалі, што яны вартыя працягнуць барацьбу за мэдалі — 52:46.

Але шлях да фіналу закрылі ўсё тыя ж гішпанкі, на якіх беларускі ўжо раз апякліся. Суперніц упэўнена вяла да перамогі бліскучая Амая Вальдэмора. Сярод нашых дзяўчат такога лідэра ў той вечар не было. Золата і срэбра выявіліся недасяжнымі для нашай каманды сёлета.

Падчас гульні за бронзу падтрымаць нашых суперніц — латыскіх баскетбалістак — прыйшоў прэзыдэнт краіны Валдзіс Затлерс. І пабачыў з трыбуны разгром сваёй каманды. Ужо ў сярэдзіне трэцяй чвэрці перавага нашых дзяўчат складала больш за дваццаць пунктаў. Але на апошняй чвэрці дзяўчаты прымусілі пахвалявацца: пэўна, сказаліся стома і напружаньне, і разрыў пачаў імкліва скарачацца. За пяць хвілінаў да фінальнага сьвістка перавага складала ўсяго чатыры пункты. Аднак у вырашальныя хвіліны гульню на сябе ўзялі лідэры зборнай — Настасься Верамеенка, Таццяна Троіна, Алена Леўчанка, Натальля Марчанка. Беларускі перамаглі 72:63. У нас бронза!

Дзіўна было сачыць за Беларускім тэлебачаньнем, якое мела правы на паказ баскетбольных матчаў. Ня кожны дзень нашы спартоўцы дасягаюць такіх посьпехаў. Але гульні за мэдалі ў жывым этэры не паказалі. Замест гэтага ў этэры «Ладу» нейкія маладзёны расказвалі анэкдоты.

Мо такая няўвага з-за таго, што баскетбол па-ранейшаму ня ўключаны ў сьпіс відаў спорту, якія маюць дзяржаўныя датацыі і льготы. У нацыянальным першынстве дагэтуль спаборнічаюць тры каманды — зь Менску, Барыса-

**Працяг на старонцы 16.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Кацярына Сныціна (справа) не пашкадавала фрызуры за мэдаль.**

Працяг са старонкі 15.

ва і Горадні. Ёсьць таксама гомельская баскетбольная школа, якая дала зборнай рэдкіх па таленце Настасьсю Верамеенку (і яе роднага брата Ўладзімера) і Алену Леўчанку. Але ўсяго гэтага надзвычай мала для паўнавартаснага дзеяньня інстытуту зборнай.

Беларуская каманда была адной з наймаладзейшых на сёлетнім першынстве. Яе лідэру — Настасьсі Верамеенцы — усяго дваццаць. 28-гадовыя Сьвятлана Вольная, Натальля Марчанка, Вольга Падабед і Натальля Трафімава лічацца «вэтэранкамі». (Для параўнаньня, Амаі Вальдэмора 31 год). Беларускай зборнай яшчэ гуляць і гуляць.

Большасьць нашых дзяўчат гартуюцца ў якасьці легіянэрак у моцных чэмпіянатах — Расеі, Польшчы, Ізраілю, Літвы, Гішпаніі. Алена Леўчанка дазналася, пачым фунт ліха ў жаночай НБА. Ня выключана, што бліжэйшым часам туды трапіць і Насьця Верамеенка. У панядзелак каманда прыляцела ў Менск. У аэрапорце быў фурор: сустракалі сто чалавек, з кветкамі і віншаваньнямі. Баскетбалісткі дзяліліся плянамі на Алімпіяду-2008, куды яшчэ трэба прабіцца. Шкадавалі, што зусім крышку не дацягнулі да золата. Кацярына Сныціна дэманстравала сваю новую — кароткую — фрызуру: яна заклалася з Настасьсяй Верамеенка, што дасьць сябе пастрыгчы, калі ўдасца заваяваць хоць які мэдаль.

Анатоль Буяльскі быў нешматслоўны: «Мы шчасьлівыя! Дзяўчаты зрабілі сапраўдны подзьвіг. Ніхто ў Эўропе ўсур'ёз не ўспрымаў нашы намеры і амбіцыі. Мы заваявалі мэдалі, магчыма, і нечакана, але цалкам заслужана. Чэмпіянат нагадваў поле бітвы. Здаровых вельмі мала, але дзяўчаты вытрымалі да канца».

Посьпех баскетбалістак параўноўваюць з хакейнай удачай на Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці і перамогай Юліі Несьцярэнкі ў Атэнах. Ёсьць і індывідуальны посьпех: Натальля Марчанка прызнаная найлепшай у Эўропе ў сваім амплюа і ўвайшла ў сымбалі-

**Трэнэр Анатоль Буяльскі: «Чэмпіянат нагадваў поле бітвы».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Самыя адданыя заўзятары Марыны Крэс.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Дзякуй

**І.Б.** з Дрыбінскага раёну.
**Б.С., Мікалаю Б.** са Сьветлагорскага раёну.
**Ігару Л.** са Стаўпецкага раёну.
**Алене С., Д.Д., Аляксею Б., Настасьсі С.** з Магілёва.
**Ірыне Ш.** з Браслаўскага раёну.
**Мікалаю Х.** са Шчучынскага раёну.
**Іне С.** з Барысава.
**Фёдару К.** з Талачынскага раёну.
**Арсеню Д.** зь Берасьцейскага раёну.
**Ганьне Р.** з Валожынскага раёну.
**Леаніду В.** з Лагойскага раёну.
**Барысу Л.** з Пухавіцкага раёну.
**А.Р., Уладзімеру А.** з Столінскага раёну.
**А.Р.** з Івейскага раёну.
**А.К.** з Крупскага раёну.
**Інэсе В., А.Ш., Сяргею З., Уладзімеру П., Віктару Л.** з Аршанскага раёну.
**І.П.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**С.Б.** зь Астравецкага раёну.
**Вользе К.** зь Берастаўцкага раёну.
**Мікалаю І.** з Лунінецкага раёну.
**Аляксею Я., В.Г., Аляксею Я., Сяргею К.** з Салігорску.
**Сяргею Д.** зь Лідзкага раёну.
**Уладзімеру З., Вячаславу П.** зь Пінскага раёну.
**В.В., Андрэю З.** са Смургоняў.
**Барысу Я.** зь Нясьвіскага раёну.
**Людміле Р.** з Капыльскага раёну
**Уладзімеру Г., Мікалаю К., Марату Ш., Сяргею В.** з Наваполацку.
**Валянціну Д., Андрэю А., Лявону Л., Леаніле Г., І.Х., Р.М., Ліяне Ш., Марыі Н., Людміле К.** зь Менскага раёну.
**Івану Ч.** з Глыбоцкага раёну.
**Юр'ю Б.** з Кобрыньскага раёну.
**Аляксандру П.** са Жлобінскага раёну.
**Віктару К., Міхаілу К.** з Рэчыцкага раёну
**Валеру С., Кацярыне П., А.П., Раісе А., Любові Л.** зь Віцебску.
**Сяргею К.** са Слуцкага раёну.
**Юр'ю К., Мікалаю Ж., Рыгору К.** з Мазырскага раёну.
**Аляксандру А., Валянціну К., Аляксандру Ф., Зоі Ж., Віталю Б., Генадзю С., Андрэю Е., Пятру П., Анатолю Х., Дз.С., С.К., Г.К.** з Горадні.
**В.К., Андрэю Н.** з Полацкага раёну.
**Сьвятлане К., Зьмітру Н.** зь Лідзкага раёну.
**Аляксандру Р., Сяргею Ц., Віталю К.** з Баранавіцкага раёну.
**Сяргшею К., Ірыне З., Івану З., Анатолю П., Антону Т., С.Н.** з Жодзіна.
**Л.Л.** з Маладачанскага раёну.
**Алене М.** зь Бярозаўскага раёну.
**Сяргею Х.** са Столінскага раёну.
**Уладзімеру Х.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Андрэю Х.** зь Мёрскага раёну.
**Валянціне Г., Тамары К., Георгію С.** зь Бешанковіцкага раёну.
**Яўгену Ф., Ю.Ф.** з Бабруйскага раёну.
**Міхаілу Г., К.М., Валеру Б., Тамары Ф., Уладзімеру Л., Мікалаю Б., Міколу Н., Вадзіму Ш., Міхаілу Ш.** зь Берасьця.
**Ніне А.** з Клімавіцкага раёну.
**Аляксандру Б.** з Капыльскага раёну.
**Мікалаю С., Івану Л., Надзеі Р.** зь Вялейскага раёну.
**Мікалаю С.** з Ганцавічцкага раёну.
**Аляксандру Г.** з Лагойскага раёну.
**Сяргею Ц.** зь Лепельскага раёну.
**Канстанціну С.** з Горацкага раёну.
**Багдану Дз., К.П., Яўгену Я., Аляксандру Л., Андрэю М., Лідзіі С., Любові П., В.П.** з Гомеля.
**Івану З.** з Пружанскага раёну.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перараказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

IN MEMORIAM




# Яўген Будзінас

Сьмерць Яўгена Будзінаса нельга назваць нечаканай, апошнія гады ён цяжка хварэў, а ўсё адно сыход ягоны застаў зьянацку...

Ня ведаю, ці можна сказаць, што мы блізка сябравалі, але адносіны ў нас былі даўнія: некалі мы разам працавалі ў рэдакцыі газэты «Знамя юности». Амаль за сорак год між намі ўсялякае здаралася, ад высокага да нізкага, але чаго не было ў нашых адносінах, дык гэта драбязы і будзённасьці, якіх ён не трываў. Яго ўвогуле як у жыцьці, гэтак і ў творчасьці цягнула да маштабнага, да вялікіх формаў і жанраў. Калі гэта дарога, дык «Дарога №1», калі бібліятэка, дык сусьветная... Нездарма разьвітаўся ён з усім і ўсімі ня чым-небудзь, а раманам, які прэзэнтаваў гэтым летам у Дудутках — таксама адным з буйных ягоных праектаў, своеасаблівым сымбалем палітычнага і культурнага жыцьця Беларусі, найперш Менску, канца XX — пачатку XXI стагодзьдзя.

Сымбалем гэтага жыцьця шмат у чым застанецца і сам Будзінас, які быў падобны на свой час гэтаксама, як час быў падобны на яго. Час злому, зьмен, узвышэньняў і падзеньняў. Час, у якім Яўген Дамінікавіч апынуўся не выпадкова, а быў запатрабаваны ім як постаць яркая, адметная, якой ад гэтай пары і цяпер ужо назаўсёды будзе не хапаць і часу, і мне.

**Уладзімер Някляеў**

# Віктар Абухоўскі



Раніцай 4 кастрычніка памёр адзін з самых таленавітых беларускіх археолягаў Віктар Абухоўскі. Ён нарадзіўся 11 кастрычніка 1973 г. у вёсцы Сялец Смаргонскага раёну і не дажыў да свайго 34-годзьдзя ўсяго тыдзень. Хвароба забрала яго імгненна, пакінуўшы нас у роспачы і безнадзейнасьці. Яшчэ два месяцы таму ён з захапленьнем расказваў мне пра Кавальцы — адно з самых старажытных палеалітычных паселішчаў, якое ён адкрыў і дасьледаваў каля Горадні на Нёмане. Страшна змучаны і стомлены ад палявой працы, Віктар марыў пра тыднёвы адпачынак у доме сваіх бацькоў каля Горадні…

Ён быў унікальным спэцыялістам. У 1998 г. Віктар скончыў Варшаўскі ўнівэрсытэт, атрымаўшы ступень «магістра археалёгіі».

Вучоба ў дактарантуры і праца над дысэртацыяй давала яму магчымасьць застацца ў Варшаве. Вядомы польскі археоляг, прафэсар Інстытуту археалёгіі Варшаўскага ўнівэрсытэту Анджэй Кэмпіста, казаў мне, што гэта быў самы лепшы ягоны студэнт, які апантана любіў археалёгію, вылучаўся незвычайнымі здольнасьцямі, працавітасьцю і эрудыцыяй. У тыя гады пра здольнага беларускага хлопца, які вывучае археалёгію ў Варшаве, мне казалі многія польскія археолягі ў Кракаве, Познані ды іншых археалягічных цэнтрах Польшчы. Віктара любілі варшаўскія студэнты, якіх ён нястомна вучыў палявой археалёгіі, вандруючы зь імі па Польшчы з адной экспэдыцыі ў другую. Тым ня менш, ён не спакусіўся на ўнівэрсытэцкую працу ў Варшаве.

У 2003 г., пасьля заканчэньня дактарантуры, ён вярнуўся ў Беларусь, прагнучы працаваць у беларускай археалёгіі. Выкладчыкам гістарычнага факультэту БДУ яго ўзялі не адразу, маўляў, не свайго гатунку, з замежным дыплёмам. Толькі са студзеня 2004 г. ён пачаў выкладаць, працуючы на катэдры археалёгіі і спэцыяльных гістарычных дысцыплін, адначасова займаючыся навукай у Інстытуце гісторыі Акадэміі Навук. У 2003 г. у Польшчы выйшла ягоная манаграфія — унікальны каталёг археалягічных знаходак з тэрыторыі Беларусі, якія многія дзесяцігодзьдзі захоўваліся ў фондах Дзяржаўнага археалягічнага музэю ў Варшаве. Іх пошуку і апрацоўцы Віктар прысьвяціў некалькі гадоў свайго жыцьця.

Дзякуючы сваёй незвычайнай энэргіі і прыцягальнасьці, яму ўдалося згрупаваць вакол сябе зацікаўленых у археалёгіі студэнтаў. Калі раней на археалягічную спэцыялізацыю студэнтаў заганялі ледзь ня сілай, то да Абухоўскага яны пайшлі самі. На нейкі момант давялося нават уводзіць колькаснае абмежаваньне. Створаны ім археалягічны клюб становіцца адным з самых папулярных на факультэце. Бурная студэнцкая археалягічная плынь, бадай, адна з асноўных дамінантаў і пазытыўных зьяваў сёньняшняга жыцьця гістарычнага факультэту БДУ.

Віктар быў захоплены працай са студэнтамі, археалягічнымі пошукамі. Ён верыў у адкрыцьцё новых помнікаў палеалітычнага пэрыяду ў Беларусі. Ён не губляў надзеі, калі амаль безвынікова скончыў археалягічныя разьведкі на пакручастых узвышшах Наваградчыны. Яму пашчасьціла каля Кавальцоў — на безнадзейнай для многіх спэцыялістаў тэрасе Нёмана, заглыбіўшы раскоп амаль на 4 м, ён упершыню за апошнія дзесяцігодзьдзі гісторыі беларускай археалёгіі, знайшоў самае старажытнае на Беларускім Панямоньні паселішча часоў палеаліту. Над тым пластом, дзе ляжаць крамянёвыя вырабы і рэшткі костак маманта, ён шчыраваў апошнія гады са сваімі адданымі студэнтамі.

Ён быў нястрымны ў сваім жаданьні працаваць і адкрываць. Каменны век быў сэнсам ягонага жыцьця. Ён быў адзіны ў Беларусі, хто зразумеў і засвоіў тэхналёгію крамянёвай апрацоўкі да той ступені, што ўмеў паўтарыць прыёмы вырабу старажытных прыстасаваньняў і прыладаў. Ён хацеў пра многае напісаць, але любіў дасканаласьць, таму старанна і доўга працаваў над сваімі кнігамі, артыкуламі і праектамі…

Няма больш Віктара — добрага і ўсьмешлівага чалавека, надзейнага сябра, аднаго з самых шчырых працаўнікоў у беларускай археалёгіі. Застаецца спадзявацца на тых студэнтаў, якія пакуль разгублена цiснуцца па кутках нашага інстытуту і ня могуць паверыць, што Віктар Сьцяпанавіч больш не павязе іх на раскопкі і ня пойдзе зь імі ўздоўж Нёмана і Пцічы шукаць самых старажытных людзей…

**Мікола Крывальцэвіч**

***

Гэты хлопец быў народжаны для археалёгіі. Яму было наканавана абудзіць беларускую археалёгію, папхнуць яе наперад. Праўда, Віктар гэтай сваёй місіі не адчуваў, альбо не надаваў вялікага значэньня, бо быў па-хрысьціянску сьціплы. Дзякуючы ягонаму інтэлектуальнаму ўзроўню, мэтадычнай і мэтадалягічнай падрыхтоўцы, набытым у варшаўскай школе археалёгіі, Віктар Абухоўскі паказаў усім нам сапраўдны прафэсійны падыход да археалягічных дасьледаваньняў. Ён як ніхто ясна разумеў галоўныя прынцыпы, мэтады і функцыі археалёгіі як самастойнай навуковай дысцыпліны.

Віктар быў несамавіта працавітым. Ён сам і разам з калегамі абышоў усе вартыя ўвагі дасьледчыка мясьціны Панямоньня. Адкрыцьцё і шматгадовае вывучэньне археалягічнага помніка ў в. Кавальцы Гродзенскага раёну назаўсёды ўпісала імя Віктара Абухоўскага ў аналы беларускай навукі.

Бесканфліктнасьць, аптымістычнасьць і мэтанакіраванасьць вылучалі Віктара Абухоўскага сярод іншых. Ён рабіў сваю справу, нягледзячы на сваркі і непаразуменьні сярод калег-археолягаў. Страшна падумаць, што лепшыя адыходзяць… Як калісьці Валера Шаблюк пайшоў з гэтага сьвету ў момант найвышэйшага ўзьлёту свайго таленту, так цяпер Віктар Абухоўскі сышоў, пакінуўшы нас з усімі нашымі дробнымі мэркантыльнымі сваркамі, якія ператвараюць археалёгію ў брудную камэрцыю, выкідаючы яе сапраўдную духоўную, высакародную сутнасьць. Мала засталося ў нашай навуцы інтэлігентнасьці і культуры.

Віктар, даруй, калі ласка, што не зьберагьлі цябе…

**Генадзь Семянчук**



**Віктар Абухоўскі (справа) у раскопе.**

# Гукі Хатыні

Піша Сяргей Будкін.

Дзіва, але беларускія музыкі неяк заўжды абыходзілі тэму Хатыні, хоць пра вайну як такую складзена нямала песень. На падзеі 22 сакавіка 1944 г. вырашылі адгукнуцца музычныя экспэрымэнтатары — беларускі лэйбал і аднайменны часопіс «Stigmata». Яны задумалі, падавалася б, маларэальную рэч — зрабіць складанку-прысьвячэньне Хатыні з удзелам сусьветных зорак, што працуюць у досыць папулярных на Захадзе і абсалютна занядбаных у нас кірунках dark ambient, industrial і gothic. Ідэя «пракачала» настолькі, што давялося нават сёетое скараціць. На працу пайшлі два гады, і вось дыск «Хатынь: Tacet, Sed Loquitur» пабачыў сьвет. Кіраўнік лэйблу і рэдактар часопісу «Стыгмата» Ігар Мацюноў натхніўся «Хатынскай аповесьцю» Адамовіча. Ён кажа, што праект можна разглядаць як альтэрнатыўны саўндтрэк да стужкі «Ідзі і глядзі».

Дыск пачынаецца з рэзкага і глухога гуку, званоў ды галасоў дзяцей, падкладзеных пад вусьцішныя гукі сынтэзатару: бяда — яна блізка, хоць зьнешне ўсё спакойна. Гэта ўводзіны ад французаў з «Propergol». Свой твор яны прысьвяцілі тым самым 75 дзецям, зажыва спаленым у беларускай вёсцы — адсюль і назва — «Seventy-five/ The Bullet Or The Flame». Кожны наступны трэк працінае яшчэ болей. Падчас гучаньня рытуальнага фолку ад магілёўскага «Pragnavit» (трэк «Попел Хатыні») з тужлівым-тужлівым мужчынскім напевам і нібы жаночымі галашэньнямі напраўду згадваюцца шакуючыя кадры зь фільму Элема Клімава. Наступная — «Lament» ад расейцаў «Cyclotimia» — гучыць ужо як рэквіем…




У нас мала хто знаёмы з падобнай музыкай, таму кожны трэк для слухача будзе адкрыцьцём. Як, прыкладам, праект італійскага навукоўца Магрыні — Bad Sector, у якім той выкарыстоўвае свае дасягненьні ў вобласьці аналягавай электронікі. Ці трэк «Prayer» на верш Марыны Цьвятаевай ад расейскага праекту Majdanek Waltz.

Але самы пранізьлівы трэк запісаў італійскі фолк-праект «Ataraxia» — іх выдатная акустычная баляда «Etretat» вызначае атмасфэру ўсяго дыску.

Вугорскі індастрыэл (Cawatana) тут спакойна ўжываецца зь літоўскім фолкам (выканаўца Donis), які вельмі сугучны зь беларускай «Зязюляй» ад Osimira. Пры канцы дыску — расейцы з Necro Stellar. Іх манатонны, нібы закальцаваны трэк амаль на 8 хвіляў, напоўнены крыкамі ды стогнамі, гучыць даволі сымбалічна, як для гэтай складанкі: усё паўторыцца ізноў, што ты ні рабі…

Выдаўцы сьвядома не скарысталі ў аздабленьні здымкаў хатынскага мэмарыялу. «У Беларусі ёсьць Хатынь, у немцаў — Дрэздэн, у японцаў — Хірасіма, можна працягваць да бясконцасьці. Зборнік можна лічыць прысьвячэньнем ня толькі Хатыні, але і кожнай вёсцы, гораду, краіне, што пацярпела ад найвялікшага злачынства», — кажуць прадусары праекту.

Хоць дыск выдадзены накладам 500 асобнікаў, яго з пэўнасьцю можна назваць праектам году.



# Нобэлі і Ігнобэлі

У Стакгольме стартаваў 106-ы нобэлеўскі тыдзень. Першыя ляўрэаты былі названыя ў панядзелак, а 12.30 паводле менскага часу.




**Станіслаў Шушкевіч: інтрыга захоўваецца да наступнага тыдня.**

Сёлетні памер прэміі — 10 мільёнаў шведзкіх кронаў (1,43 млн даляраў). Ляўрэат атрымлівае таксама дыплём і залаты мэдаль з выявай Альфрэда Нобэля.

У чацьвер стане вядомы ляўрэат у вобласьці літаратуры, на наступным тыдні — ляўрэат Нобэлеўскай прэміі міру. Сярод вядомых намінантаў сёлета — беларус Станіслаў Шушкевіч, а таксама чачэнская юрыстка Лідзія Юсупава, былы віцэ-прэзыдэнт ЗША Альбэрт Гор (за дзейнасьць у абарону навакольнага асяродзьдзя), Марці Ахцісаары (за ўклад у замірэньне ў Намібіі і Косаве).

Завершыцца Нобэлеўскі тыдзень 15 кастрычніка, у гэты дзень стане вядома, каму дастанецца прэмія ў вобласьці эканомікі.



**Марыё Капэкі.**

## Фізіялёгія і мэдыцына: ствалавыя клеткі

У галіне фізіялёгіі і мэдыцыны. Прэміі атрымалі італьянец Марыё Капэкі, брытанец Марцін Эванс і амэрыканец Олівэр Сьмітс. Пра гэта абвесьціў Каралінскі мэдыка-хірургічны інстытут, што знаходзіцца ў стакгольмскім прыгарадзе Сольна. Навукоўцы распрацавалі тэхналёгію, якая дапамагае вывучаць ствалавыя клеткі.



**Марцін Эванс.**



**Олівэр Сьмітс.**

## Фізыка: цьвёрдыя дыскі

Ляўрэатамі ў галіне фізыкі сталі француз Альбэр Фэр і немец Пэтэр Грунбэрг. Прэмію ім далі за адкрыцьцё эфэкту гіганцкага магнітасупраціву, які паклаў пачатак сьпінтроніцы — тэхналёгіі апрацоўкі і захоўваньня дадзеных.



**Альбэр Фэр.**

Адкрыцьцё навукоўцаў знайшло сваё адлюстраваньне пры распрацоўцы кампутарных цьвёрдых дыскаў, зрабіўшы іх меншымі і больш ёмістымі.



**Пэтэр Грунбэрг.**

Таксама гэты эфэкт выкарыстоўваецца пры счытваньні інфармацыі зь цьвёрдых дыскаў. Ад моманту адкрыцьця, якое было зробленае дасьледчыкамі незалежна адзін ад аднаго, да ўручэньня прэміі прайшло цэлых 19 гадоў.

## Хімія: паўправаднікі

Прэмію ў галіне хіміі атрымаў нямецкі навуковец Герхард Эртль. Ён дасьледаваў хімічныя працэсы на цьвёрдых паверхнях. Працы Эртля леглі ў аснову вытворчасьці паўправаднікоў, выпрацоўку некаторых угнаеньняў, а таксама дапамагаюць разумець працэсы, якія адбываюцца ў азонавым слоі атмасфэры.

Герхард Эртль нарадзіўся ў 1936 годзе ў Штутгарце. Ён зьяўляецца ганаровым прафэсарам бэрлінскага інстытуту імя Фрыца-Хабэра таварыства Макса Плянка.



**Герхард Эртль.**

**ЗП**

## Уручаныя прэміі за самыя недарэчныя адкрыцьці году

Ігнобэлеўская прэмія, Ig Nobel prize, колькі б яе ні называлі «антынобэлеўскай», «шнобэлеўскай» і «гнобэлеўскай» — даволі значная прэмія, яе абы каму не дадуць. А дадуць толькі таму, хто правёў сапраўдную, сур'ёзную навуковую працу… якая проста прывяла да неардынарных вынікаў. Ёю ганаравалі ў чацьвер, 4 кастрычніка, у Тэатры Сандэрса Гарвардзкага ўнівэрсытэту. Прэміі ўручалі ўладальнікі сапраўднай «Нобэлеўкі».

**Прэмія ў галіне навук пра харчаваньне**

Сутнасьць: Чым больш перад чалавекам ежы, тым больш ён яе зьесьць. Праверана на добраахвотніках.

**Прэмія па мэдыцыне**

Сутнасьць: Глытаньне шпаг мае пабочныя эфэкты, небясьпечныя для вашага здароўя. Некаторыя з гэтых эфэктаў ледзь ня сталі фатальнымі для дасьледчыкаў.

**Прэмія па фізыцы**

Сутнасьць: Складкі на прасьцінах паддаюцца фармалізацыі. Малюнак разнастайных складак, які мы можам назіраць на прасьцінах, мала чым розьніцца ад малюнку складак на чалавечай скуры ці на скуры жывёл, лічаць дасьледчыкі.

**Прэмія па біялёгіі**

Сутнасьць: Складзены поўны пералік разнастайных кляшчоў, скарпіёнаў, павукоў, прымітыўных расьлінаў і мікраарганізмаў, якія сустракаюцца ў ложку чалавека.

**Прэмія па хіміі**

Сутнасьць: Практычная дэманстрацыя таго, што пацукі ня могуць адрозьніць, ці чалавек гаворыць на японскай мове, ці на галяндзкай, калі гаворка гучыць «задам наперад».

**Прэмія па літаратуры**

Сутнасьць: Вывучэньне пэўнага артыкля «the» і асаблівасьцяў, якія ствараюць праблемы пры яго напісаньні.

**Прэмія міру**

Сутнасьць: Прапанова дасьледчай лябараторыі Вайскова-паветраных сілаў ЗША распрацаваць «гей-бомбу», нелетальную хімічную зброю, пад узьдзеяньнем якой варожыя жаўнеры будуць адчуваць сэксуальны юр адно да аднаго.

**Прэмія па эканоміцы**

Сутнасьць: Запатэнтаванае новае прыстасаваньне для банкаў, з дапамогай якога можна скінуць сетку на рабаўнікоў.

**Прэмія па авіяцыі**

Сутнасьць: Выяўлена, што хамякі, якім даюць «Віягру», хутчэй узнаўляюцца пасьля пералёту праз некалькі гадзіньнікавых паясоў.

# ЬЬЬ

*— Но известно ли его сиятельству... что здесь дело особенной тонкости?*
*— Нет тут никакой тонкости, и дело самое простое, полицейское, — отрезал Ведищев.*
Борис Акунин «Смерть Ахиллеса»

Піша **Даніла Жукоўскі.**

У міжнародных кодах радыёабмену ёсьць два сыгналы, у якіх воляю выпадку вялікую ролю адыгрывае мяккі знак. Першы — сыгнал тэрміновасьці «ЬЬЬ». Другі — абразьлівы сыгнал, які кірыліцаю перадаецца «ЩЬЬ». Ім палохаюць маладых радыётэлеграфістаў, бо ягоны зьмест: «памяняйце апэратара».

Сп. Дубавец шмат гадоў выкарыстоўвае адну й тую ж мэтоду з чаргаваньня дзьвюх тактыкаў.

Першая частка: палымяным, разумным, але бескампрамісным — часам аж да ксэнафобіі — артыкулам сьцьвярджаць свае права вызначаць для пэўнай грамады (дзеля прыстойнасьці назавем гэтых людзей «паплечнікамі-аднадумцамі»), што ў Беларусі належыць лічыць *нашым*, а што *нянашым*. У выпадку, калі сродак гуртаваньня й ідэалягічнага падпарадкоўваньня працуе слаба, публіцыст не спыняецца перад тым, каб паспрачацца сам з сабою ў сеціве, апублікаваць шчымлівую, але прыдуманую гісторыю і да т.п.

Другая частка палягае на тым, каб праз пэўны час прапанаваць адмовіцца ад уласнаручна ўзьнятай на шчыт догмы ўзамен на ... саступкі супраціўнага боку? Супраціўны бок зь дзіўнай упартасьцю маўчыць наконт якіх-небудзь саступак. Прапануецца адмовіцца ад сымбалю веры, бо ... гэтак будзе лепш для Беларусі.

Досьвед «змаганьня за тарашкевіцу» як нішто іншае яскрава паказвае, што палітычны інструмэнтар у культурніцкім змаганьні выключна неэфэктыўны. Тут працуе або адміністрацыйны, або ўласна культурны рэсурс. Руслан Равяка дапамог старэйшаму калегу выявіць нішчымнасьць апошняга. У сваіх інвэктывах наконт «Вікіпэдыі» сп. Равяка зрабіў дзьве істотныя памылкі. Па-першае, *абедзьве* «Вікіпэдыі»: і наркамаўская (be.wikipedia.org/wiki), і тарашкевіцкая (be-x-old.wikipedia.org/wiki), даступныя ў Інтэрнэце. Па-другое, колькасьць артыкулаў прыблізна аднолькавая (наркамаўская — 6912, тарашкевіцкая — 7670). Тарашкевіцкая істотна перавышае наркамаўскую колькасьцю карыстальнікаў: 885 і 294 адпаведна, але пра гэта сп. Равяка ня згадвае, бо хутчэй за ўсё ня надта цікавіцца той «Вікіпэдыяй». Цяжка бараніць правы або рэчы, якімі не карыстаесься сам (але, магчыма, лічыш для кагосьці абавязковымі).

Гэтак два чалавекі яскрава асьвятлілі два бакі «праблемы тарашкевіцы»: выключна нізкую эфэктыўнасьць абраных спосабаў барацьбы за «вяртаньне клясычнага правапісу» і сьціпласьць культурнага даробку, на які барацьбіты абапіраюцца. Калі зь першым бокам вызначыцца лёгка (менавіта — сыгналізуючы ЬЬЬ і ЩЬЬ), другі патрабуе шырэйшага разгляду.

Для руху «вяртаньня тарашкевіцы» характэрная трывучая нязгода, чаго, уласна кажучы, рух дамагаецца. Нават у позьнім, падагульняючым апытаньні «Ці добра ўчынілі адраджэнцы канца 80-х, зрабіўшы выбар на карысьць «тарашкевіцы»?» («Arche» №3’2003) уражвае стракатасьць меркаваньняў. Тарашкевіца ў сучасным разуменьні гэтага панятку не паддаецца, нібы тое Дао, апісаньню словам. Сьмешна — бо толькі словам усё гэта ёсьць: дакладней, яшчэ менш — правапісам словаў. Але правапіс згадваюць хіба тыя, хто лічыць захапленьне «тарашкевіцай» памылкай адраджэнцаў. Хто лічыць гэта правільным, або адзіна магчымым крокам, бачыць у мяккіх знаках нешта большае: «*Нацыя, якая вучыць мову па трасянкавых слоўніках, чытае творы, напісаныя беларускай савецкай мовай, асуджаная на марудную, а значыць, больш небясьпечную асыміляцыю,*» — кажа Павал Жук у згаданым апытаньні. І дзе тут правапіс? Зьмест слова «тарашкевіца» за дзесяцігодзьдзі перажыў вялізарную эвалюцыю — амаль што як слова *падводнік*, якое ў вядомым творы М. Гарэцкага «Дзьве душы» значыць ні больш ні менш — чалавека, які кіруе *падводаю* і ня мае аніякае канатацыі з марскімі хвалямі.

Зьяўляючыся міжвольным карыстальнікам тарашкевіцы ў якасьці чытача й аўтара, я часам перачытваў уласныя тэксты ў пошуках таго, што новага дадалі ў іх руплівыя рэдактары, старанна перарабіўшы маю амаль школьную (зь невялікім аднак злоўжываньнем «й», «ня» і «бяз») наркамаўку на «клясычны правапіс». Дадатковых сэнсаў, і ў першую чаргу — далучанасьці да нейкае глыбейшае традыцыі, дадатковых, нарэшце, эстэтычных вартасьцяў у клясызаваных варыянтах я не адчуў. Але пераробка была неабходнаю — дзеля таго каб выданьне, якое друкавала мае тэксты, заставалася самім сабою. Вытрымала фармат. Захавала вернасьць ідэі.

У правапісе зь мяккімі знакамі адчуваецца сымбалічны й эстэтычны патэнцыял. Можа, да таго спрычыніліся выхаваныя ў не вядомых мне менскіх установах (неяк недарэчы тут будзе слова «вучэльня») радыёдыктаркі зь іхным чыгунна-зацьвярдзелым вымаўленьнем, але для мяне культурныя героі нашага мінулага заўсёды гавораць «па-тарашкевіцку». Калі я чытаю ў Францішка Аляхновіча дыялёгі Попутчіка з савецкімі чыноўнікамі, мне заўсёды падаецца, што было б добра падаць іхныя словы наркамаўкаю, а ягоныя — зь яшчэ большаю колькасьцю мяккіх знакаў. Мяккія знакі ў маім уяўленьні замацаваліся менавіта за гэтаю мэнтальнасьцю, пазначанаю ў літаратуры «Тутэйшымі», «Самсонам Самасуем»... ды эпітафіяй у выглядзе «Ў капцюрох ГПУ». На жаль, гэтая мая тарашкевіца-сымбаль, за рэдкімі выключэньнямі кшталту асобных тэкстаў сп. Балахонава, не знаходзіць апірышча ў сучасным прыгожым пісьменстве. Мне нават падаецца, што літаратурная палітыка адпаведных выданьняў зусім ня лічыцца зь неабходнасьцю *мастацкай* прапаганды сваёй правапіснай лініі.

Прырода працэсу, выкліканага рухам «за тарашкевіцу», заклікала да антыдагматычнай варыянтнасьці, экспэрымэнту, гульні з магчымасьцямі, разгортваньня й выпрабаваньня альтэрнатываў, сутыканьня ілбамі розных моўных традыцыяў. Перш за ўсё — у мастацкай прасторы. Вось дзе б разгарнуцца постмадэрністым! Оксфардзкі акцэнт Вя-

## Parvać pašparty

Mianie ździŭlaje utapičnaje «čakannie biełaha dymu». Nie dačakajecie, budźcie realistam. Bo xto ž pasadzić razam u adnym pamiaškanni našyx movaznaŭcaŭ i akademičnyx? Nacyja adsunuta na kuxniu. Ad Dubaŭca, jaki zhadvaje pra Larysu Hienijuš, ja čakaŭ inšaha aryginalnaha vyjscia z kuxni — parvać pašparty. Abo treba stajać, xaj sabie i na kuxni, ale da kanca, jak toj Sotnikaŭ. A ŭsie hetyja xitryki Rybakovy pryviaduć da borny, dzie i paviesicca nia zmožaš.

**Henik Lojka**




СЯМЁН ПЕЧАНКО

чоркі («лё-лё-сьсь... лё-лё-сьсь»), каўкаскія («Грузыя», «грузыны») захапленьні Пазьняка, напаўнепісьменная наркамаўшчына «Звязды», псэўдастараславянскія экзэрсісы мітрапаліцкіх мовапісцаў, дзівосы ад Пацюпы і Булгакава ў колішніх «Фрагмэнтах», супэрнаркамаўскі пераклад Дантэ Ўл.Скарынкіна...

Нягледзячы на ангажаванасьць у правапісныя спрэчкі інтэлектуалаў і пісьменьнікаў, мастацкага асэнсаваньня апазыцыя «камуністычнага» й «рэпрэсаванага» правапісу не атрымала (хаця быў някепскі першы акорд — паэма С. Сокалава-Воюша «Ь»). Шмат гадоў (ад першае хвіліны, калі гэта стала дазволеным) сатырыкі шырока выкарыстоўваюць трасянку, супрацьпастаўленьне беларускай і расейскай мовы зрабілася стандартнай зброяй палемістаў і аратараў, а вось дыхатамія савецкага і клясычнага правапісу, або правакацыйная варыянтнасьць апошняга, больш не натхнілі, здаецца, анікога. Перадумовай творчае разьняволенасьці ёсьць, аднак, прызнаньне роўнасьці паміж удзельнікамі спаборніцтва, згода на крытыку ўласнае ідэі. Гэтага выпрабаваньня прыхільнікі моўнае рэформы не адолелі.

Крывадушнічалі тыя, хто казаў пра разьняволеньне творчага патэнцыялу. Усім карцела ўсталяваць свой правапісны стандарт, не забываючыся на абмежаваньні ў лексыцы і як хутчэй прасунуць яго ў школу. Іншага спосабу, як эксплюатаваць паслухмянасьць школьнага настаўніка, які — калі загадаюць — будзе прапагандаваць гіерагліфіку і клінапіс, нашы *філёзафы, палітолягі, сацыёлягі, пісьменьнікі і публіцыстыя* ня ведаюць — гэтаксама, як іхныя супраціўнікі — *філосафы, палітолагі, сацыёлагі, пісьменнікі і публіцысты.*

Існавала й існуе плынь практычнае эвалюцыі правапісу, справакаваная дзейнасьцю «тарашкевічаўцаў». Незнарок легітымізаваная празь іхную актыўнасьць варыянтнасьць (бо замест адзінага клясычнага правапісу ўжываецца безьліч варыянтаў) дазваляе і ў наркамаўцы шырэй карыстацца «ня» і бяз». Элемэнты «клясычнасьці» прасочваюцца ў напісаньні запазычаньняў і ўласных імёнаў, іншых лексычных навацыях. Тарашкевіцкі праект даў вынікі на кірунках, дзе не патрабавалася прымусу.

Створаная прастора свабоды, на жаль, засталася незаселенаю вартым тэкстам, які б апраўдваў яе існаваньне (для правапісу гэта ці не адзіна магчымы аргумэнт). Але непараўнальна жахлівей, што нягледзячы на несур'ёзнае выкананьне, стаўленьне да пытаньня заўсёды было звышсур'ёзным, быццам пасьля абнародваньня вынікаў працы нейкае групы створаны ёю звод адразу ж зробіцца абавязковым з унясеньнем адпаведнага артыкулу калі не ў Крымінальны, то ў Адміністратыўны кодэкс (і амаль што дачакаліся, але зь іншага боку!).

Калі што можа выправіць сумнае становішча «клясычнага правапісу» (выраз я бяру ў двукосьсе, бо ягоны сэнс на сёньня аніяк ня зводзіцца да правапісу), дык гэта хіба што істотны мастацкі высілак. Прапанаваны «Радыё Свабода» конкурс «Адзін дзень у БНР» стварае для таго выдатную нагоду. У жанры альтэрнатыўнае гісторыі тарашкевіца сапраўды мае больш правоў за наркамаўку. Іншая рэч, ці гатовыя аўтары да гэткага выкліку і ці дазволіць ім гэткі крок асяродзьдзе. Але калі нам сапраўды дарагі «рэпрэсаваны правапіс», варта ўжыць яго там, дзе ён можа сябе праявіць — у канструяваньні візіі Беларусі, альтэрнатыўнай сёньняшняй. На гэтым полі можна змагацца нават з расейшчынай: сёньня бо найбольшым ростам колькасьці карыстальнікаў можа пахваліцца мова не расейская ці беларуская, а мацерная.

З гэткага гледзішча далейшы лёс, скажам, нашаніўскага праекту залежыць менавіта ад саміх тапельцаў: працягваць абсалютызацыю палітычных тэхналёгіяў ці зьвярнуцца з большаю ўвагаю да сродкаў мастацтва могуць толькі яны самі.

## Рэзалюцыя

**удзельнікаў «круглага стала», прысьвечанага абмеркаваньню Праекту Закону «Пра правілы беларускай артаграфіі і пунктуацыі»**

Мы канстатуем, што ў Рэспубліцы Беларусь склалася нездавальняючая сытуацыя з ужываньнем дзяржаўнай беларускай мовы ў розных сфэрах грамадзкага жыцьця. Прапанаваны Праект Закону «Пра правілы беларускай артаграфіі і пунктуацыі», на нашу думку, ніякім чынам не прадугледжвае паляпшэньня сытуацыі і не спрыяе пашырэньню выкарыстаньня дзяржаўнай мовы тытульнай нацыі краіны.

З моваЗнаўчага пункту гледжаньня — на дадзены момант адсутнічаюць перадумовы для якаснага складаньня новага артаграфічнага зводу з улікам сучасных патрабаваньняў лінгвістычнай навукі: не распрацаваныя тэарэтычныя асновы правапіснай кадыфікацыі, ня маюць строгага акрэсьленьня артаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы; да гэтага часу ня створана электронная база беларускай мовы.

Зь юрыдычнага пункту гледжаньня — зьвяртае на сябе ўвагу тое, што правядзеньне зьмен у правапісе прапануецца ў форме закону. У выніку яго прыняцьця грамадзяне, якія карыстаюцца беларускай моваю, будуць дыскрымінаваныя, бо Праект Закону прадугледжвае «адзіныя Правілы беларускай артаграфіі і пунктуацыі, якія ўстанаўліваюць аднастайнасьць пісьмовай беларускай мовы і зьяўляюцца абавязковымі на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь»; аднак падобнае адзінства і аднастайнасьць артаграфічных і пунктуацыйных нормаў не прадугледжваецца ў адносінах да іншых моў, у тым ліку ў адносінах да другой дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь — расейскай.

У сувязі з вышэйсказаным мы лічым неабходным зрабіць наступнае:

1) адкласьці прыняцьце зьмен у правапісе беларускай мовы ў форме закону — да аднаўленьня рэальнага функцыянаваньня беларускай мовы ў асноўных сфэрах дзейнасьці дзяржавы;

2) апублікаваць Праект новай рэдакцыі Правілаў беларускай артаграфіі і пунктуацыі ў дзяржаўных друкаваных СМІ;

3) арганізаваць шырокае грамадзкае абмеркаваньне Праекту новай рэдакцыі Правілаў;

4) правесьці навуковую канфэрэнцыю па праблемах беларускага правапісу;

5) правесьці парлямэнцкія слуханьні па праблеме прыняцьця новай рэдакцыі Правілаў.

*Менск, 28 верасьня 2007 г.*

# Нацыянальная Царква

Піша **Аляксандар Шрамко.**

Нацыянальная Царква… Памесная Царква… Аўтакефальная Царква... У гэтых словах для кагосьці шмат чаго салодкага чуецца. Але ці мы добра разумеем, пра што гаворым, і ці дакладна ведаем то, чаго так хочам?

Дык вось, з трох гэтых аспэктаў сёньня спынімся на прыметніку «нацыянальная» ў дачыненьні да Царквы. Ня буду пакуль вельмі «грузіць», проста хацеў бы адзначыць галоўныя пункты, якія выклікаюць пытаньні.

Як вядома, «нацыянальны» ў дачыненьні да любой рэчы можна разумець у двух сэнсах.

Па-першае, у сэнсе моўна-культурным, а па-другое, у дзяржаўна-сувэрэнным.

Што можа значыць патрабаваньне да Царквы, каб яна была «нацыянальнай» у першым сэнсе? Наколькі гэта залежыць ад таго ці іншага падпарадкаваньня?

Гэта значыць, што Царква павінна быць «сваёй» па мове і культуры для мясцовага насельніцтва. Вось тут ёсьць часта такое неразуменьне, якое можа прывесьці да ерасі, якая мае сваю назву — філятызм (ад словаў «любіць» і «племя»). Царква заўсёды павінна арыентавацца менавіта **на ўсё насельніцтва тэрыторыі**, на якой яна выконвае сваю місію. Не на нейкі адзін народ ці племя, а на ўсіх людзей, ніяк не вылучаючы тых ці іншых. Апостал Павал, напрыклад, зьвяртаўся сваімі пасланьнямі да рымлянаў, карынфянаў, эфэсянаў — да хрысьціянаў усіх нацыянальнасьцяў адпаведных гарадоў. Гэта тычыцца і мовы — перш за ўсё, Царква павінна размаўляць на найбольш распаўсюджанай у дадзенай мясцовасьці мове. І як бы мы ні ставіліся да страты народам сваіх моўных каранёў, але ўсё ж гэта ня справа Царквы займацца моўным адраджэньнем. Яе мэта — выратаваньне чалавека. Царква павінна адказаць чалавеку на той мове, на якой чалавек да яе зьвярнуўся.

Так у тэорыі, але на практыцы ёсьць спэцыфічныя складанасьці. Першая зь іх тая, што на самой справе філятычная ерась пануе амаль над усім праваслаўным сьветам. Асабліва добра гэта бачна па дыяспары — у Эўропе, Штатах, Канадзе. Мы бачым на адной тэрыторыі і «рускія», і «грэцкія», і «румынскія», і «ўкраінскія», і «беларускія» праваслаўныя Цэрквы. Але **паводле канонаў на адной тэрыторыі павінна быць толькі адна юрысдыкцыя**. Зразумела, у межах гэтай адзінай юрысдыкцыі могуць быць прыходы, арыентаваныя на розныя моўныя і нацыянальныя групы. У Амэрыцы была спроба стварыць такую адзіную Царкву. Так стварылася Праваслаўная аўтакефальная Царква ў Амэрыцы. Між іншым, на базе расейскіх прыходаў з адпаведна атрыманай ад РПЦ аўтакефаліяй. І назва «ў Амэрыцы», а не «Амэрыканская» якраз была пакліканая выказаць тэрытарыяльны, а не нацыянальны прыярытэт. Хаця Царква выйшла моцнай і плённай (напрыклад, багасловы Меенфдорф і Шмэман якраз адтуль), але сама ідэя наднацыянальнай Царквы фактычна правалілася. Філятычныя прыхільнасьці ў іншых амэрыканскіх юрысдыкцыях перамаглі, і Праваслаўная Царква ў Амэрыцы міжвольна стала Царквой амэрыканцаў і амэрыканскай.

Вельмі моцныя філятычныя тэндэнцыі і ў РПЦ. Апошні час яны ўсё больш павялічваюцца. І яна сама сябе дэкляруе ў пераважнасьці «Царквой рускіх», і менавіта так успрымаецца. Зразумела, такая сытуацыя вельмі ўплывае на тое, што ў нерасейскіх частках РПЦ непазьбежна растуць і свае патрабаваньні. І хаця кола тых, хто патрабуе «сваёй» «нацыянальнай» Царквы, пакуль вельмі абмежаванае, і нават у большасьці гэта і нецаркоўныя людзі, але тэндэнцыя будзе мацнець, бо калі ёсьць Царква «рускіх», то чаму нельга быць Царкве «беларусаў»? Зразумела, лягічна, што ў самастойнай дзяржаве можа быць нейкае самастойнае кіраваньне. Не для пыхі, канечне, што «самі з вусамі», ня дзеля «нацыянальнай годнасьці», а проста таму, што кожная краіна мае сваю спэцыфіку, розную сталасьць грамадзтва, розныя адносіны зь дзяржавай і г. д. Карацей, для больш адпаведнай мясцовым умовам дзейнасьці дзеля справы выратаваньня чалавека. Але, на жаль, пытаньне ў такім выглядзе, груба кажучы, як «Царква для беларусаў» — гэта памылковы шлях.

Дарэчы, парадокс расейскага праваслаўя ў тым, што, па сутнасьці, як мы казалі, «Царква для расейцаў» застаецца незразумелай для тых жа расейцаў, бо расейская мова ў набажэнствах амаль не выкарыстоўваецца (апрача нешматлікіх супольнасьцяў, як вакол сьвятара Георгія Качаткова, пазбаўленага нават свайго прыходу). Гэтая сытуацыя прывучае вернікаў да таго, што яны мала што разумеюць, што маліцца быццам трэба на «высокай» мове, а не на «побытавай». Як ні дзіўна, у «нацыянальнай Царкве» няма месца для сваёй мовы, нават існуе нейкая непавага для яе.

Чаму так сталася? Таму што Царква ў Расейскай імпэрыі была пастаўлена ў ранг абслугоўвальнага дзяржаўныя інтарэсы ведамства. Дзяржаўная місія стала перашкаджаць асноўнай місіі Царквы, нават самым простым патрабаваньням людзей. Пра людзей вельмі лёгка забыць, калі ёсьць больш «глябальныя» мэты. Вось так і мы рызыкуем, калі патрабуем ад Царквы, каб яна служыла на сувэрэннасьць, беларушчыну і г. д. Царква павінна быць Царквой для людзей. Калі гэта будзе так, яна хутка будзе адклікацца на патрабаваньні часу, і разам з галоўнай мэтай, дзеля якой яна створана, выконваць, як быццам між іншым, натуральна, і іншыя заданьні ў галінах асьветы, выхаваньня і г. д.

На гэтым пакуль спынюся, але размова, думаю, працягнецца.

Айцец Аляксандар Шрамко вядзе ўласны блог на сайце nn.by

## ХАСАН АЙ’ОВІЧ

А ЯНО Ў НАС РАСЬЦЕ...

Што расьце зьверху ўніз? — корань!
Што расьце з ранку да абеду? — голад!
Што расьце ад абеду да заходу? — цень!
Што расьце зь неба да зямлі? — маланка!
Што расьце ўначы? — сон і жахі!
Што расьце вышэй за горы? — нябёсныя гмахі!
Што расьце змоладу? — ілюзіі ды крылы!
Што расьце ў старасьці? — горб ды ўспаміны!

Што расьце зімой? — мары пра лета!
Што расьце летам? — расьце ўсё!
Што расьце ўвосень? — «зАкрамя ў родзіны!»
Што расьце, калі нічога не расьце? — стат-паказчыкі ў калгасах!
Што расьце задам наперад? — беларуская дзяржаўнасьць!
Што расьце ў адзін бок? — беларуская шматвектарнасьць!
Што расьце на эміграцыі? — кветкі настальгіі!
Што расьце на айчыне? — калючкі роспачы!
Што расьце ўглыб нас? — нашы крыўды!
Што расьце «супраць» нас? — суседзкае багацьце!
Што расьце ў галавах нашых? — пляны ды прарывы!
Што расьце ў душы? — надзеі на лепшыя пэрспэктывы!

**Хай расьце ды высьпявае,
прыйдзе час — усё пазьбіраем!**

## АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ

***

Жыцьцё без пакутаў.
Пакуты бяз болю.
Віно без атруты.
Турма безь няволі.

Малітва бяз грэху.
Спакуса бязь сьмеху.
Хаціна бяз рэха,
бяз рэха і грэху.

Жыцьцё без самоты,
нуды, адзіноты.
Жыцьцё празь цябе
наўпраткі навылётам.

Бяз хрыпу і енкаў,
бяз зроку і зрэнкаў
бязрукімі пальцамі
лашчым і мацаем.

На сонны, бязродны,
цяжарны сьвітанак
выходзім даесьці халодны
сьняданак.

Утулак па шыю ўтульны
і толькі
іголкі, іголкі, іголкі, іголкі.

Вялікі, магутны
і неабсалютны!
Не высакародны
ваш вырак... А родны...

## ВАДЗІМ БОЛБАС

ТРАВА МЭГАПОЛІСУ

Пацягнула прайсьціся па роснай траве
У дзень асеньняга раўнадзенства.
Гэты покліч таемны ў сэрцы жыве
Як прывет з пракавецьця, з маленства.

Не па лузе над рэчкай, а ў горадзе, тут,
Дзе між гмахаў разьлеглі газоны
Дзе дамы, як грыбы, сярод поля растуць
а ў вокнах дамоў тых вазоны.

Наступіў мэгаполіс, сяло праглынуў.
Тут цяпер і мэтро і тралейбус.
Нібы ліст у канвэрт у асфальт загарнуў
Урадлівую тлустую глебу.

Захмялелы ад восеньскага сьвятла,
Не чакаў, што знаёмца сустрэну.
Ды, як спадчына вёскі, што калісь была,
Прарасло праз газон лісьце хрэну.

Тут насуперак часу былое жыве,
Непарушны прыроды законы.
Мо таму так прыемна ісьці па траве
Не па сьцежцы. Наўпрост па газоне.



Берастаўіца. Гісторыя і сучаснасьць.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Сьвятлана Длатоўская: «Дызайн — гэта найперш філязофія»

Сьвятлана Длатоўская — дызайнэр, які займаецца вопраткай. Ды не, што я такое кажу! Хіба такія словы патрэбна ўжыць, калі расказваеш пра цуды, якія Сьвятлана дастае зь вялікай шафы і раскладае і разьвешвае перада мной? Кожны строй — непаўторны і стыльны.

**«НН»: Сьвятлана, Вашыя працы сапраўды ўражваюць. Такое ня часта пабачыш. Але колькі ж часу займае праца над кожнай мадэльлю?**

**Сьвятлана Длатоўская:** Каля двух месяцаў.

**«НН»: А як нараджаюцца вобразы для калекцыі?**

**СД:** Па-рознаму. Часамі нешта падказвае сама тканіна — гэта найчасьцей лён, божая сьвечка. Часамі штуршок дае нейкая сустрэча, пачутая гісторыя, яшчэ нешта.

**«НН»: А адкуль Вашая зацікаўленасьць вопраткай, адкуль такое майстэрства шыцьця ды вышыўкі? Дзе вытокі Вашага вытанчанага стылю?**

**СД:** Мусіць, з многіх крыніц. Паводле адукацыі я прамысловы дызайнэр, але жыцьцё склалася так, што ў прафэсію я не пайшла. Таму праца зь металам, дрэвам, пластмасай для мяне адпала. А тканіна, ніткі — яны заўсёды пад рукой, яны лёгкія і ўдзячныя. Цікавасьць да дызайну — бясспрэчна, ад бацькі Аляксандра Длатоўскага, які быў першым старшынём Саюзу дызайнэраў Беларусі. Ён працаваў як раз у галіне прамысловага дызайну. У часы майго дзяцінства ўсе езьдзілі на жыгулях ды запарожцах, а мы — на адмысловай машынцы, якую бацька сам прыдумаў і вырабіў. Да слова, дызайн новага тралейбусу, які нядаўна выйшаў на вуліцы Менску, таксама распрацаваў ён.

А ўменьне шыць, пачуцьцё стылю — ад бабуль. Вясковая бабуля Вольга была адмысловай майстрыхай. Рэчы, якія яна рабіла, ня толькі ўпрыгожвалі жыцьцё, але літаральна ратавалі яго: падчас вайны сям'я аказалася ў казацкай станіцы, і яна выменьвала іх у багатых казачак на прадукты. А тыя рэчы, што бабуля дарыла сваякам тут, потым амаль містычным чынам вярталіся ў сям'ю: іх прывозілі і аддавалі, мусіць, разумеючы, што ў вёсцы яны зваляюцца, згубяцца... На гэтых рэчах, на ўменьнях і памяці маёй бабулі мая цётка Марыя Віньнікава, па сутнасьці, зрабіла сваю дысэртацыю, прысьвечаную аднаўленьню страчаных спосабаў беларускага ткацтва. Яна цяпер працуе ў музэі этнаграфіі Акадэміі навук, займаецца як раз народнымі строямі. А гарадзкая мая бабуля Сьвятлана шыла таксама адмыслова, практычна ўсё — ад бялізны да футраў. І прабабуля Вікторыя была майстрыха, да таго ж яна вельмі ганарылася тым, што паходзіць са шляхецкага роду, «з двара караля Сыгізмунда», і заўсёды падкрэсьлівала гэта ўсімі сваімі паводзінамі.

**«НН»: Вашая беларускасьць — ад іх жа? Ці гэта быў сьвядомы выбар сьвядомага ўзросту?**

**СД:** Не, гэта было адразу. Гэта ў крыві.

**«НН»: Вашая калекцыя недзе выстаўлялася?**

**СД:** На выставе «Пагоня», якая адбылася вясной, было

некалькі строяў зь яе. А ў бліжэйшых плянах —узяць удзел у фэстывалі этнамоды, што адбудзецца ў Італіі.

**«НН»: Вашыя мадэлі зробленыя менавіта на Вас. А няма жаданьня рабіць нешта на замову, адкрыць, можа, майстэрню?**

**СД:** Мне цікава рабіць рэчы для іншых. Калі я іду на Дзень Волі, або на сустрэчу бацькоў ліцэістаў, або на нейкую іншую апазыцыйную акцыю, я заўсёды абдумваю, як буду выглядаць, каб быць, што называецца, на месцы і да месца, каб акцэнтаваць увагу менавіта на тым, што адбываецца. Мне б было цікава дапамагчы ў гэтым і іншым. Бо, хаця на падобных мерапрыемствах людзі зьбіраюцца прыгожыя, са сьветлымі тварамі і разумнымі вачыма, адчуваецца, што на вопратку ў большасьці ні часу, ні імпэту нестае.

**«НН»: А Вы лічыце, што вопратка вартая выдаткаваньня часу і імпэту?**

**СД:** Безумоўна. Час павінен выдаткоўвацца і на зьнешнасьць — тады больш гарманічным будзе і духоўны сьвет. Часам на моладзі можна пабачыць нейкія крэатыўныя ідэі, але наогул заўважна, што прафэсійнай рукі нам не хапае. Мая мара — Модны дом беларускасьці.

**«НН»: А для каго зь вядомых беларусаў Вам хацелася б зрабіць вопратку?**

**СД:** Мне хацелася б, напрыклад, распрацаваць карпаратыўны стыль для Беларускага калегіюму. Гэта такая ўнікальная зьява, там сабраліся такія ўнікальныя людзі... Дызайн — гэта найперш філязофія, і мне цікава было б апранаць філёзафаў, пісьменьнікаў, творцаў.

**«НН»: Сьвятлана, Вы жанчына рэдкаснай, чароўнай прыгажосьці. Вы сапраўды можаце быць Тварам, увасабляць ідэю — любая ідэя ад гэтага толькі выйграе. А як Вы ставіцеся да таго тыпу прыгажосьці, які прадукуе беларускае тэлебачаньне: у лепшым выпадку — пустога, у горшым — пошлага?**

**СД:** Ну, яны, відаць, лічаць, што робяць нешта ўжнае.

**«НН»: Сымона дэ Бавуар у свой час вельмі пратэставала супраць такой уежнасьці на францускім тэлебачаньні.**

**СД:** Напэўна, яна мела рацыю. Але рэдактарам беларускіх каналаў далёкія пратэсты Сымоны дэ Бавуар (*сьмяемся*).

**«НН»: Калі я рыхтавалася да гутаркі з Вамі, то дратавала знаёмых пытаньнем: што вам цікава ведаць пра Сьвятлану Длатоўскую? Усе як адзін апытаныя мужчыны без усялякага роздуму, адразу адказвалі: пра яе асабістае жыцьцё!**

**СД:** Тады напішыце: варыянты разглядаюцца! (*Весела сьмяецца*).

**«НН»: Вы жартуеце?**

**СД:** Не, чаму? На паперы я замужам... Але чатыры гады назад, калі дачка пайшла ў Ліцэй, муж пайшоў з дому.

**«НН»: Менавіта з-за гэтага?**

**СД:** Складана сказаць. Ён бізнэсовец, і, пэўна, адчуваў з-за маіх перакананьняў нейкі ціск, і ўрэшце рэштаў ня вытрымаў.

**«НН»: Вы, здаецца, рэч у сабе: вось у Вас дом, дзеці, вось калекцыя цудоўных рэчаў, якую Вы, падалося, ня вельмі і імкнецеся прэзэнтаваць... Як бы Вы падсумавалі, чаму Вас навучыла жыцьцё? Як імкнецца жыць Сьвятлана Длатоўская?**

**СД:** Не замінаць іншым, але ж рабіць тое, што ты хочаш і можаш. Ня варта дапускаць тых, каго ня хочаш бачыць, у сваю прыватную прастору. Трэба ўсё ж умець трымаць коўдру над сабой, не даючы яе сьцягваць.

**«НН»: Лёс Вас вядзе, шкадуе? Ці ўсё ж ня літасьцівы да Вас?**

**СД:** У мяне такое ўражаньне, што спачатку ён мяне вельмі падставіў, а потым увесь час выбачаўся (*сьмяецца*)! Мая калекцыя — гэта вынік гэтага самага спрыяньня.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# Шыльды па Гарэцкім і Арсеньневай



Пад патранажам Таварыства беларускай культуры ў Вільні адкрытыя памятныя дошкі Натальлі Арсеньневай і Максіму Гарэцкаму.

Шыльды былі ўсталяваныя ў Базылянскіх мурах, дзе знаходзілася Беларуская гімназія. У 20-х гадох XX ст. аўтарка гімну «Магутны Божа» навучалася ў той гімназіі, а настаўнікам беларускай мовы ў яе быў Максім Гарэцкі.

Некалькі гадоў таму тут ужо адкрывалі памятную бронзавую дошку па Натальлі Арсеньневай, аднак неўзабаве яна была скрадзеная невядомымі зламысьнікамі. Над новымі шыльдамі ўсталяваная відэакамэра.

«Сёньня вельмі радасна, што Максім Гарэцкі й ягоная ўлюбёная вучаніца сустрэліся разам амаль праз 90 гадоў. Іх дух тут, з намі», — сказаў на адкрыцьці акадэмік Радзім Гарэцкі, пляменьнік Максіма Гарэцкага.

Мэмарыяльныя шыльды стварыў беларускі скульптар Алесь Шатэрнік. Мастак прызнаўся, што першапачаткова плянавалася ўсталяваць дошку ў Расеі, дзе доўгі час жыў клясык. Аднак, як заўважыў Шатэрнік, Расеі беларуская прарокі непатрэбныя.

На ўрачыстасьці прысутнічалі віленскія беларусы, а таксама прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў. Менавіта іх коштам былі выробленыя дошкі. Прадстаўнікі афіцыйных уладаў Беларусі на адкрыцьці памятных шыльдаў ня былі заўважаныя.

**СМ; Польскае радыё для замежжа**

# Канфіскавалі гістарычную кнігу? Атрымайце перавыданьне

Перавыдадзена праца пісьменьніка і журналіста Юркі Віцьбіча «Антыбальшавіцкія паўстаньні і партызанская барацьба на Беларусі».

Наклад кнігі быў сканфіскаваны ў сакавіку, напярэдадні Дня Волі, на офісе Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына».

Кніга расказвае пра супраціў саветам у 1920—30-я. Упершыню яна была выдадзена ў 1996 г. у Нью-Ёрку Беларускім інстытутам навукі і мастацтва, але ў Беларусь тады трапілі лічаныя асобнікі.

У прадмове де перавыданьня дасьледчык эміграцыі Лявон Юрэвіч напісаў: «Віцьбіч лічыў сваю працу не падрыхтоўчым матэрыялам для наступных дасьледнікаў, а хутчэй падмуркам і арыенцірам у моры хлусьні і няведаньня, з чым пастаянна сутыкнецца будучы гісторык. Было ў яго яшчэ адно жаданьне — разбурыць легенду «о тихом и непротивляющемся злу белорусе».

Таксама неўзабаве плянуецца перавыданьне сканфіскаваных разам зь Віцьбічам «Людзей СБМ» Юр'я Туронка.

**Ул. інф.**

**Віцьбіч Ю. Антыбальшавіцкія паўстаньні і партызанская барацьба на Беларусі.** Смаленск, 2007. — 308 с.

# Дыназаўр у кубачку






http://www.tanakaland.org



# Булгак у Вільні

Піша Людвіка Кардзіс.

26 верасьня ў Вільні адкрылася рэтраспэктыўная выстава фотамастака Яна Булгака «Ян Булгак–фатаграфік». Арганізатары — Літоўскі мастацкі музэй, Варшаўскі нацыянальны музэй. Партнэры — Польскі інстытут, Віленская мастацкая акадэмія. На адкрыцьцё выставы прыехаў унук фатографа Багдан Булгак і ўнук Рушчыца — таксама Фэрдынанд Рушчыц, дырэктар Варшаўскага нацыянальнага музэю.

Першы раз у Літве зьявілася магчымасьць агледзець такую значную калекцыю. На выставе 446 прац. Выстава склалася з калекцыі польскіх і літоўскіх музэяў з Варшавы, Лодзі, Кракава, Уроцлава, Літоўскага мастацкага музэю, Віленскай мастацкай акадэміі, сямейных архіваў Булгакаў і Рушчыцаў. Беларускіх партнэраў няма.

Выстава багатая. Мяне вёў туды найбольшы інтарэс: можа, будзе невядомы дагэтуль партрэт Францішка Аляхновіча? Партрэт выглядзела на выставе Булгака ў Варшаве праўнучка драматурга Эмілія Аляхновіч. Партрэта на гэты раз не было на выставе. Але было мноства віленскіх здымкаў, Вільні, якой ужо няма. Той нашай беларускай Вільні. Углядаюся ў здымкі касьцёла Сьв. Міхала, хочацца знайсьці айца Адама Станкевіча. Няма. Але ёсьць нейкі няўлоўны дух яго. Ён усё адно тут. На выставе шмат Наваградчыны, рэшткі вежы (у параўнаньні з тым, што маем сёньня — проста замак) у Крэве, Багданава, дом Рушчыцаў, інтэр'ер іхнага дому. І нейкі адчай скоўвае мяне — сёньня гэтага нічога няма. Няма таго духу, тых людзей, дамоў. І ці адновіцца гэта калі-небудзь. Параўноўваю рэшткі замку ў Троках і ягоны сёньняшні выгляд. Усплываюць Крэўскі, Наваградзкі, Гальшанскі замкі… Афармлена выстава густоўна. Але зноў мой сум: надпісы пад кожнай працай на дзьвюх мовах — літоўскай і польскай. Нас, беларусаў, няма. А не патрэбныя мы. Як бы і ня нашыя краявіды складаюць большасьць выставы.

Сапраўднай сэнсацыяй для мяне была калекцыя фатаздымкаў Абдона Карзона. Здымкі прывезеныя з Парыжу. У калекцыі польскай бібліятэкі. Стэрэаскапічныя здымкі. А.Карзон меў у Вільні на вуліцы Вялікай недзе каля 1859 г. фотаатэльле шырокага профілю. Ён раней за іншых фатографаў зрабіў абшырныя здымкі Вільні, у 1860 г. аўтар зафіксаваў будоўлю чыгуначнага тунэлю ў Панарах. А здымак 1863 г. прымусіў мяне доўга ўглядацца ў яго. Вуліца Вялікая, людзі, зафіксаваныя там, былі сьведкамі нашага паўстаньня, сьмерці Кастуся Каліноўскага...



Увечары за гарбатай мы разважаем, чаму не далучыліся да беларускага руху Ян Булгак, Фэрдынанд Рушчыц і іншыя прадстаўнікі тагачаснай тутэйшай інтэлігенцыі? Булгак свае фатаздымкі друкаваў у тагачаснай «Нашай Ніве». Чаму не падаўся ім прывабным вобраз той нашаніўскай Беларусі. Прыйшлі да высновы, што і мы сёньня не з усімі, як бы і блізкімі па ідэях, беларусамі можам дамовіцца і ня хочам мець супольных спраў зь імі. Хіба што, і ў той час кожны меў сваю праўду, свае прычыны.

А выставу наведаць варта.

**Працаваць яна будзе да 11 лістапада. Адрас: Вялікая (Didzioji), 4. Вільня. Кошт квітка — 5 Lt або 1.45 EUR.**



# Міхаіл Сяўрук




**У мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) да 10 лістапада** працуе выстава жывапісу і графікі Міхаіла Сеўрука. Выстава працягвае адкрытую на пачатку году сэрыю праектаў, прысьвечаную прыватным зборам жывапісу ў Беларусі. Міхаіл Сяўрук атрымаў мастацкую адукацыю ў Віленскім унівэрсытэце. Першыя ягоныя творы экспанаваліся на выставах 1937—38 у Варшаве. Пасьля Другой сусьветнай вайны ён жыў у Нясьвіжы і працаваў пераважна з жанравай карцінай і пэйзажам. Раскіданасьць ягоных прац па мастацкіх зборах розных краін (Беларусь, Польшча, Літва) ускладняе вывучэньне спадчыны. Група энтузіястаў, калекцыянэраў і мастакоў, знаўцаў беларускага жывапісу XX ст. сабрала ў гэтым праекце як жывапісныя, так і графічныя працы Міхаіла Сеўрука.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**12 (пт)** — «Маэстра».
**13 (сб)** — «Смак яблыка».
**14 (ндз)** — «Макбэт»
**15 (пн)** — «Каханьне ў стылі барока».
**17 (ср)** — «Ромул Вялікі».
**18 (чц)** — «С.В.»
**19 (пт), 20 (сб)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**21 (ндз)** — «КІМ».
*ранішнія спэктаклі*
**14 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
**21 (ндз)** — «Афрыка».
*малая сцэна*
**12 (рт)** — «Адчыніце Кантралёру!».
**18 (чц)** — «Апэльсынавае віно».
**21 (ндз)** — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**12 (пт)** — «Ганна ў тропіках».
**13 (сб)** — «Адэль».
**14 (ндз)** — «Дамавічкі».
**14 (ндз)** — «Сёстры Псыхеі».
**16 (аўт)** — «Чорны квадрат».
**17 (ср)** — «Іванаў».
**18 (чц)** — «Містэр Розыгрыш».
**19 (пт)** — «П'емонцкі зьвер».
**20 (сб)** — «Палёты з анёлам».
**21 (ндз)** — «Кабала сьвятош (Мальер)».

**Падрыхтавала НБ;**
**www.belmuseum.org**

## ВЫСТАВЫ

**Дарога дадому**

**У Мастацкім музэі да 10 лістапада працуе выстава твораў Міколы Селешчука «Дарога дадому»,** прымеркаваная да 60-годзьдзя з дня народзінаў мастака. Выстаўленыя найлепшыя графічныя працы, станкавыя лісты, ілюстрацыі да дзіцячых кніг, жывапісныя творы.

**Цэсьлер & Войчанка**

**Да 5 лістапада тамсама працуе выстава «Цэсьлер & Войчанка. Плякаты».**

**Адкрыцьцё выставы Ўладзімера Новака ў Нью-Ёрку**

**У Беларускім музэі ў Брукліне** працуе выстава мастака Ўладзімера Новака. Уладзімер Новак нарадзіўся 20 траўня 1939 г. у Крычаве. Ягонае мастацтва вызначаецца плястычнай выразнасьцю, арыгінальнай кампазыцыяй. Гэта мастак манумэнтальна-дэкаратыўнага жывапісу. Меў шэраг пэрсанальных выставаў у Эўропе, у прыватнасьці ў Нямеччыне, Баўгарыі, Аўстрыі ды іншых краінах. У Амэрыцы экспануецца ўпершыню. У музэі былі прадстаўленыя 27 алейных карцінаў, якія ахопліваюць больш за сорак год ягонай працы. Невялічкія палотны нясуць у сабе набой энэргіі і настрою. Кожны твор мае свой незабыўны характар, унутраны эмацыйны падтэкст, шчырасьць, натхненьне. Кожнае палатно пабудавана дакладна і разумна. Карціны вельмі жывыя, калярытныя і яркія. Жывапісная структура кожнай ягонай карціны запоўненая сымбалямі колеру, якія падпарадкоўваюцца агульнай задумцы. Палотны Новака нясуць у сабе музычны і народны пачатак, вытрымку і стрыманасьць. Выстава будзе працягвацца да 19-га лістапада.

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

**19 кастрычніка ў кавярні Палацу моладзі (Старавіленскі тракт, 41)** пройдзе прэзэнтацыя кніжкі Алеся Камоцкага і Вадзіма Грудзька «48». Даведкі праз т.: (029)253-25-04.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Папярэдніца Ўмы Турман і тэатар у акупацыі

З рэтраспэктывы **Франсуа Труфо.**

**Маладая была ў чорным**

Францыя — Італія, 1967, каляровы, 107 хв.

**Рэжысэр:** Франсуа Труфо

**Ролі выконваюць:** Жанна Маро, Мішэль Буке, Жан-Клёд Брыялі, Шарль Дэнэр, Мішэль Ляндаль, Даніэль Булянжэ

**Жанр:** Трымценьнік

**Адзнака:** 9,5 (з 10)

Маладая (Жанна Маро) аўдавела адразу пасьля вянчаньня. Невядомыя застрэлілі яе мужа на царкоўным ганку. Дэпрэсія магла завершыцца самагубствам, але гераіню выратавалі. І цяпер справа яе жыцьця — помста. Крок за крокам, разважліва яна забівае кожнага зь пяці вінаватых. І нішто ня можа яе спыніць…

Задоўга да Ўмы Турман, якая з асалодаю адпомсьціла Білу, была Жанна Маро — стрыманая, пачуцьцёвая, француская ікона незалежнага эўрапейскага кіно. Крымінальная карціна Труфо прасякнутая пяшчотай, лірызмам і візуальнай выкшталцонасьцю.

Ляціць у паветры фата, мсьціціца апранае касьцюм паляўнічай-Дыяны, выгінаецца чорны рот… Гісторыя помсты пададзеная Труфо з тактам, болем і адстароненым холадам.

**Апошняе мэтро**

Францыя, 1980, каляровы, 133 хв.

**Рэжысэр:** Франсуа Труфо

**Ролі выконваюць:** Катрын Дэнёў, Жэрар Дэпард'ё, Жан Пуарэ, Андрэа Фэрэоль, Полет Дзюбо, Жан-Люі Рышар, Хайнц Бэнэнт, Марыс Рыш

**Жанр:** Драма

**Прызы:** Прэміі «Сэзар» за найлепшы фільм, найлепшую рэжысуру, найлепшыя мужчынскую і жаночую ролі, найлепшую музыку, гук, дызайн, найлепшае апэратарскае мастацтва. Намінацыі на прэміі «Залаты глёбус» і «Оскар» за найлепшы замежны фільм — усяго 12 узнагародаў і 3 намінацыі.

**Адзнака:** 10 (з 10)

Акупаваны нацыстамі Парыж. Акторка Марыён Стэйнэр (Катрын Дэнёў) хавае свайго мужа-габрэя ў склепе тэатру. Пад ягоным кіраўніцтвам яна ставіць п'есу. Але нечакана гераіня закахалася ў актора Бэрнара (Жэрар Дэпард'ё).

Вялікі фільм пра любоў, адказнасьць, чалавечнасьць і мастацтва, якое дапамагае застацца людзьмі. Сюжэт, немагчымы для сёньняшняй Беларусі.

Натхнёныя «Апошнім мэтро» Аляксандар Качан і Андрэй Кудзіненка складалі сцэнар навэлі, дзеяньне якой адбываецца ў менскім тэатры падчас акупацыі. Але фільм яшчэ ня зьняты.

Фільмы дэманструюцца ў Музэі гісторыі кіно (вул.Сьвярдлова, 4), сэансы а 15.00 і 18.30. Даведкі праз т. (017)227-10-75.

**Андрэй Расінскі**

# Андрэй Хадановіч

# Абм€ньнік

Першая аўдыёкніжка

з сэрыі

«Дыскарня «Наша Ніва»

*з музычным суправаджэньнем*




ш у к а й ц е   ў   н е з а л е ж н ы х   р а с п а ў с ю д н і к а ў


## КАЛІ Б...

**...Мікалай Чаргінец, камэнтуючы законапраект аб барацьбе з анархіяй ў сеціве, свае словы «ў выпадку неабходнасьці сайт будзе зачынены» разумеў літаральна.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

— Сёньня я, здаецца, аж трошкіператаміўся, змагаючыся з апазыцыйнымі сайтамі. 400 разоў зачыніў сайт «Свабоды», 357 разоў сайт Мілінкевіча і 467 — сайт «Хартыі».

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Яўгену М.** Ідэя інтрыгоўная, але такая распрацоўка яе апашліла. Ня сьмешна.

**Алесю.** Верш не для друку. Шукайце натхненьня.

**Юр'ю Б. з tut.by.** Дзякуй за добрыя словы. І мы ў гэта верым.

## ФОТАПРАКОЛ




СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Во так віншаваньне БРСМ упісалася ў адну менскую кінаафішу.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Мінск.** З атчота галоўнага турэмнага ўпраўленьня відаць, што ў Менскай турме трымаюць цяпер 643 чал. У тым — палітычных 97 мужчын і 21 кабета. Многа хворых: у бальніцы турэмнай аж 666 чал.

**«Наша Ніва». №2. 1908**





# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыцеся дамову. Дэталі — **старонка 17.**


«Нашу Ніву» пытайцеся на сядзібе ТБМ у Менску (Румянцава, 13) кажны будні дзень ад 17.00 да 19.00.


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВЫХАВАЦЕЛЬКА

**Дзіцячаму садку №187** трэба выхавацелька з добрымі ведамі беларускай мовы. Т.: 288-06-71, 403-15-35

### МАБІЛЬНІК

**Nabudu mabilnik** užytkavany. T.: 299-05-81, 955-92-04 Henik

### ШЧАНЮКІ

**Тэрмінова прадаюцца** 2-х месячныя шчанюкі тыгровага баксёра з радаводам. Т.: 323-53-99, альбо kassia@tut.by

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем** 13 кастрычніка (субота): Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзясятнікі—Валожын. 3-4 лістапада: Вільня-Коўна. Т. 292-54-58; GSM 622-57-20; 509-12-16



# Наша Ніва

н е з а л е ж н а я   г а з э т а

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 10.10.2007.

Замова № 5562.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.